ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 28 (1354) | Серада, 8 красавіка 1959 года | Цана 40 кап.

БЛІЖЭЙ ДА ЧЫТАЧА

АДЗІН З ЛІТАРАТУРНЫХ крытыкаў не так даўно прыехаў з Мінска ў Магілёў чытаць лекцыю «Марксісцка-ленінскае разуменне літаратуры і мастацтва». Брытык прадумаў кожнае палажэнне, кожны тэзіс лекцыі. Паслухаць яго прыйшлі не толькі студэнты, выкладчыкі літаратуры педінстытута, на якіх ён разлічваў, але і многія рабочыя і служачыя — слухачы народнага Універсітэта культуры. Іх цікавілі новыя творы пра нашых сучаснікаў — будаўнікоў камунізма, якасць гэтых твораў. Нарэшце, яны хацелі даведацца, над чым працуюць беларускія пісьменнікі зараз. І лектару давялося, як кажуць, перабудоўвацца на ходу — замест тлумачэння загадзя прадуманых тэзісаў адказваць на канкрэтныя пытанні.

Гэты і многія іншыя прыклады сведчаць аб узросшых патрабаваннях савецкага чытача да сваёй літаратуры, да мастацкіх твораў. Безумоўна, не ва ўсіх чытачоў аднолькавыя густы. Ёсць сярод іх і такія, каго больш цікавяць дэтэктыўныя рманы, кнігі з нейкімі «надзвычайнымі» сітуацыямі. Масавага ж чытача перш за ўсё хвалюе і цікавіць у літаратуры сённяшняе жыццё народа, вобраз сучасніка, раскрыты ў побыце, працы, ва ўсім багацці яго ўнутранага свету.

Галоўная тэма літаратуры — тэма сучаснасці. Гэтага ніхто не будзе аспрэчваць. Прызванне кожнага пісьменніка ў тым, каб, ідучы па гарачых слядах падзей, глыбока вывучыўшы іх, у яркіх і праўдзівых вобразах, выразнымі мастацкімі сродкамі паказаць наша сённяшняе жыццё. «Няма больш высакароднай і больш высокай задачы, чым задача, якая стаіць перад нашым мастацтвам — адлюстраваць гераічны подзвіг народа — будаўніка камунізма», — гаварыў таварыш М. С. Хрушчоў у дакладзе на XXI з'ездзе КПСС. Пры гэтым не трэба забываць, што якім бы ні быў актуальным твор па тэме, па часу, адлюстраваным у ім, ён павінен быць перш за ўсё высокамастацкім па форме, глыбокім па зместу. Майстэрства пісьменніка заключаецца не толькі ў рабоце над словам, але і ва ўменні заглянуць глыбока ў душу чалавека, у здольнасці заўважыць самае характэрнае ў жыцці, тое, што хвалюе пачуцці і думкі многіх людзей. Майстэрства — гэта тая асноўная ніць, якая звязвае пісьменніка з чытачом. Чым лепшы твор — тым хутчэй ён дойдзе да чытача і тым больш людзей яго прачытае.

Бывае ж, нажаль, яшчэ так, што добры, высокамастацкі твор, над якім пісьменнік працаваў гадамі, выношваючы яго, укладваючы ў яго ўсе свае пачуцці, не адразу трапляе да шырокай масы чытачоў, затрымліваецца дзесьці на паўдарозе ад выдавецтва да бібліятэкі — грамадскай або асабістай. І не па віне пісьменніка або выдавецтва, якія быццам недастаткова папрацавалі над кнігай, не па віне бібліятэкі, якая быццам не жадае прыдбаць тую або іншую кнігу. Дзесьці на гэтай дарозе сустракаюцца яшчэ бар'ерчыкі, якія затрымліваюць рух кнігі ад пісьменніка да чытача. Бяздушныя, абыякавыя людзі вельмі адказную і пачэсную справу распаўсюджвання і прапаганды мастацкай літаратуры пускаюць на самацёк. Аб гэтым гавораць многія факты.

Не так даўно Магілёў наведала група пісьменнікаў, якія выступалі перад чытачамі. Многія людзі хацелі купіць кнігі гэтых аўтараў, атрымаць аўтографы. Але патрэбных кніг не аказалася ў кніжных магазінах. Паехалі шукаць на адну базу — няма, на другую — няма, на трэцюю прыехалі — ляжаць кнігі ў цёмных кутках вялізнымі пакункамі, пад шматгадовым пластом пылу.

Многія пісьменнікі, калі выязджалі ў далёкія раёны на сустрэчы з чытачамі, былі сведкамі падобных фактаў. У кніжных магазінах сталіцы, напрыклад, не было ўжо ніводнага экземпляра рамана П. Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах», які выйшаў з друку масавым тыражом. Аўтар сам абыйшоў усе кніжныя склады, базы ў Мінску і не знайшоў сваёй кнігі. А ў гэты час у Полацку на кніжнай базе знаходзілася некалькі тысяч экземпляраў рамана. Ці ж гэта не сведчанне абыякавасці, бяздушнасці, што яшчэ ёсць у некаторых працаўнікоў кніжнага гандлю ў адносінах да такой адказнай справы, як прапаганда і распаўсюджванне мастацкай літаратуры.

Многае ў гэтай справе залежыць і ад саміх пісьменнікаў, ад работы пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі. Цэнтральны Камітэт КП Беларусі нядаўна прыняў пастанову «Аб стане і мерах паляпшэння кніжнага гандлю ў сельскай мясцовасці рэспублікі», у якой адзначыў, што Саюз пісьменнікаў БССР дрэнна займаецца прапагандай кніг. З мэтай паляпшэння справы распаўсюджвання мастацкай літаратуры прапанавана рэгулярна праводзіць сустрэчы пісьменнікаў з працоўнымі, лекцыі, даклады і гутаркі аб літаратуры, «Дні пісьменніка», канферэнцыі чытачоў, арганізоўваць выстаўкі і вітрыны навінак беларускай літаратуры ў магазінах, сельскіх культасветустановах і школах.

Калі ў правядзенні гэтых мерапрыемстваў прымуць удзел усе празаікі, паэты, драматургі і крытыкі, будуць дасягнуты, безумоўна, вялікія поспехі. Трэба толькі ўмела арганізаваць кожную сустрэчу пісьменнікаў з чытачамі, каб яны прыносілі ўзаемную карысць. Што дае, напрыклад, такая сустрэча, калі два — тры літаратары прыедуць на завод ці ў калгас, пабудуць там гадзіну — паўтары, прачытаюць па некалькі вершаў — і назад дамоў. Не вельмі прыемнае ўражанне пакідаюць выступленні пісьменнікаў перад чытачамі, якія арганізуе бюро прапаганды пры СП БССР. Трэба падумаць аб тым, каб перабудаваць работу бюро ў іншым напрамку. Ці не лепш праводзіць літаратурныя вечары пасля таго, як пісьменнікі пабываюць на прадпрыемстве, у калгасе, пазнаёмяцца з людзьмі, каб затым выступіць перад імі, расказаць пра тое, што бачылі, паслухаць іх. Гэта будзе не проста літаратурная сустрэча, а добрае знаёмства пісьменніка з чытачом, з яго патрабаваннямі. Такія сустрэчы магчымы тым больш цяпер, калі многія пісьменнікі Беларусі выязджаюць на вялікія будоўлі сямігодкі, у калгасы, на прадпрыемствы.

Слушная прапанова выказана на пашыраным прэзідыуме СП БССР аб тым, каб пасяджэнні секцыі Саюза пісьменнікаў і іншыя нарады праводзіць непасрэдна на прадпрыемствах, у навучальных установах з удзелам чытачоў — рабочых, служачых, студэнтаў. Прысутнічаючы на секцыі, чытачы змогуць не толькі выказаць думкі аб тых або іншых творах, але і ўнесці прапановы, як лепш наладзіць работу творчых секцый.

Адзін з найбольш дзейсных сродкаў прапаганды мастацкай літаратуры, умацавання сувязі пісьменніка з чытачом — правядзенне канферэнцый па абмеркаванню новых твораў. Але і ў гэтай справе ёсць яшчэ многа недахопаў. Масавыя бібліятэкі, установы культуры, камсамольскія арганізацыі, якія наладжваюць канферэнцыі, выносяць на шырокае абмеркаванне толькі творы, якія ўжо атрымалі добрую ацэнку і прызнанне ўсёй грамадскасці, завяваліпапулярнасць, і забываюць пра тыя многія творы, аб якіх яшчэ крытыка не сказала сваё слова. Не трэба чакаць, пакуль хто-небудзь першы дасць ацэнку таму або іншаму твору. З'явіўся ў часопісе новы раман, прачыталі яго дзесяць — дваццаць чалавек — адразу ж можна вынесці яго на абмеркаванне. Няхай чытач першым скажа сваё слова.

Варта заўважыць, што, праводзячы канферэнцыі чытачоў, нашы бібліятэкі і іншыя культурныя ўстановы чамусьці забываюць аб паэтычных кнігах. Паэзію, як і прозу, чытаюць многія, асабліва моладзь. Добрая паэма ці лірычны верш хвалююць сэрцы чытачоў, як і раман з цікавым сюжэтам, вострым канфліктам. Чаму б не вынесці на абмеркаванне чытачоў, напрыклад, новую кнігу лірыкі П. Панчанкі, зборнік М. Танка «След блікавіцы», які атрымаў прэмію імя Янкі Купалы, або паэму А. Русецкага «Другі пачатак», пра якую, дарэчы, ніхто яшчэ з нашых крытыкаў не сказаў сваё слова. Праводзячы канферэнцыі чытачоў, неабходна надаваць належную ўвагу ўсім жанрам літаратуры, усім творам, вакол якіх могуць узнікнуць цікавыя творчыя размовы.

Шмат магчымасцей і форм масавай работы ёсць для таго, каб шырэй прапагандаваць здабыткі нашай літаратуры. Але самая асноўная з гэтых форм — жывая, штодзённая сувязь пісьменніка з жыццём. Чым бліжэй ён будзе да чытача, чым больш знаходзіцца ён у гушчыні жыцця, тым большымі будуць яго поспехі ў творчай рабоце і грамадскай дзейнасці.

ПЕРШАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

ДЗЕННІК СЕСІІ

Учора, 7 красавіка, у Мінску пачала сваю работу Першая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі пятага склікання.

Задоўга да адкрыцця сесіі залы пасяджэнняў Вярхоўнага Савета БССР у Доме ўрада запоўнілі выбраннікі беларускага народа.

Месцы ў ложах займаюць таварышы **К. Т. Мазураў, В. І. Казлоў, М. Я. Аўхімовіч, Ц. Я. Кісялёў, Ф. А. Сурганаў, Ц. С. Гарбуноў, Д. Ф. Філімонаў, С. К. Цімашэнка, І. Ф. Клімаў, А. І. Золаў, І. М. Макараў, У. Г. Каменскі**, члены Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, міністры.

Дэпутат **І. М. Макараў** прапануе даручыць адкрыццё Першай сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР пятага склікання адному са старэйшых дэпутатаў Вярхоўнага Савета — народнаму пісьменніку Беларускай ССР, віцэ-прэзідэнту Акадэміі навук БССР **К. К. Атраховічу** (Крапіве).

Дэпутат К. К. Атраховіч (Крапіва), адкрываючы сесію, гаворыць кароткую ўступную прамову.

Прамова дэпутата К. К. Атраховіча (Крапівы)

Таварышы дэпутаты! Першая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі пятага склікання адкрываецца ў абставінах велізарнага палітычнага і працоўнага ўздыму савецкага народа, выкліканага гістарычнымі рашэннямі XXI з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. З'езд азнаменаваў уступленне нашай краіны ў новы важнейшы перыяд у яе развіцці — у перыяд разгорнутага будаўніцтва камуністычнага грамадства, намеціў велічную праграму далейшага ўздыму эканомікі, культуры і матэрыяльнага дабрабыту працоўных.

Зацверджаная XXI з'ездам партыі грандыёзная праграма камуністычнага будаўніцтва радуе і глыбока хвалюе ўсіх савецкіх людзей, усіх сапраўдных сяброў Савецкага Саюза, змагароў за вялікую справу камунізма. У велічных лічбах народнагаспадарчага плана мы бачым сваё прамяністае заўтра, сваю магутнасць, свае неабмежаваныя творчыя магчымасці. Ажыццяўленне сямігадовага плана прадугледжвае стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, выкананне асноўнай эканамічнай задачы нашай дзяржавы — дагнаць і перагнаць найбольш развітыя капіталістычныя краіны па вытворчасці прадукцыі на душу насельніцтва.

Велічныя задачы сямігодкі выклікалі небывалы прыліў творчай ініцыятывы савецкіх людзей, іх гарачае імкненне і жаданне папрацаваць наславу для дасягнення пастаўленых мэт.

Беларускі народ, як і ўсе народы Савецкага Саюза, горача і аднадушна адобрыў рашэнні XXI з'езду партыі, успрыняў сямігадовы план як сваю кроўную справу, як баявую праграму дзеяння. У рэспубліцы ўсё шырэй разгортваецца ўсенароднае сацыялістычнае спаборніцтва за дэтэрміновае выкананне сямігадовага плана.

Сваю згуртаванасць вакол роднай Камуністычнай партыі, сваё аднадушнае імкненне ажыццявіць велічную праграму пабудовы камуністычнага грамадства беларускі народ з велізарнай сілай яшчэ раз прадэманстраваў у час выбараў, якія нядаўна адбыліся, у Вярхоўны Савет Беларускай ССР і ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.

Выбары вышэйшага і мясцовых органаў дзяржаўнай улады рэспублікі ўвянчаліся поўнай перамогай народнага блоку камуністаў і беспартыйных і выліліся ў магутную дэманстрацыю непарушнага адзінства партыі і народа.

Таварышы дэпутаты! Прайшло чатыры гады з таго часу, як адбыліся выбары Вярхоўнага Савета Беларускай ССР чацвёртага склікання, а якіх велізарных поспехаў за гэты час дабіўся савецкі народ пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ва ўсіх галінах гаспадаркі, навукі і культуры!

Праведзеныя пасля XX з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза мерапрыемствы па далейшаму развіццю савецкай дэмакратыі і ўмацаванню сувязі дзяржаўнага апарату з масамі, па развязванню актыўнасці і творчай ініцыятывы працоўных, далі плённыя вынікі ва ўсіх галінах дзяржаўнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Расшырэнне правоў саюзных рэспублік і мясцовых Саветаў, рэарганізацыя кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам, мерапрыемствы па далейшаму развіццю калгаснага ладу і рэарганізацыя машынна-трактарных станцый далі магчымасць дабіцца яшчэ больш поспехаў у развіцці народнай гаспадаркі БССР.

У гэтым годзе беларускі народ разам з усімі народамі нашай Радзімы ўрачыста адзначыў знамянальную дату ў сваёй гісторыі — 40-годдзе Камуністычнай партыі Беларусі і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

За паспяховае аднаўленне разбуранай у перыяд вайны народнай гаспадаркі і буйныя дасягненні беларускага народа ў далейшым развіцці прамысловасці, будаўніцтва, сельскай гаспадаркі і культуры рэспубліка была ўзнагароджана другім ордэнам Леніна.

Працоўныя нашай рэспублікі ведаюць, што сваімі дасягненнямі, сваім свабодным і шчаслівым жыццём яны абавязаны Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і яе баявому штабу — ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту, які ўпэўнена вядзе савецкі народ да камунізма.

У адказ на высокую ўзнагароду, на ўсе клопаты Камуністычнай партыі беларускі народ будзе яшчэ больш настойліва змагацца за выкананне гістарычных рашэнняў XXI з'езду КПСС, за перамогу камунізма ў нашай краіне.

Таварышы дэпутаты! Выбіраючы Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, працоўныя аказалі нам вялікае давер'е і ўсклалі на нас вялікія і адказныя задачы. Гэта аказанае нам выбаршчыкамі высокае давер'е абавязвае нястомна працаваць на карысць народа, добрасумленна выконваць свае дэпутацкія абавязкі.

Дазвольце мне выказаць упэўненасць у тым, што дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР з гонарам апраўдаюць высокае давер'е народа і аддадуць усе сілы пабудове камуністычнага грамадства ў нашай краіне.

Няхай жыве вялікі савецкі народ — будаўнік камунізма!

Няхай жыве Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка!

Няхай жыве Камуністычная партыя Савецкага Саюза — натхняльнік і арганізатар усіх нашых перамог!

* * *

Па прапанове дэпутата Ф. А. Сурганава, які выступіў па даручэнню Савета старэйшын, сесія аднагалосна выбірае Старшыней Вярхоўнага Савета Беларускай ССР сакратара ЦК КП Беларусі дэпутата Ц. С. Гарбунова (Кіраўская выбарчая акруга, Віцебская вобласць). Дэпутат Ц. С. Гарбуноў займае месца за сталом Старшыні Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Затым па прапанове дэпутатаў І. Б. Пазнякова, Г. Г. Панамарова, А. Е. Корнева і В. К. Луцкіна, якія выступілі па даручэнню Савета старэйшын, намеснікамі Старшыні Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аднагалосна выбіраюцца дэпутаты Е. М. Дзмітровіч (Гогалеўская выбарчая акруга, г. Мінск), І. М. Калілец (Агарэвіцкая выбарчая акруга, Брэсцкая вобласць), Е. П. Чагіна (Даўгінаўская выбарчая акруга, Маладзечанская вобласць), А. П. Лагацкі (Самахвалавіцкая выбарчая акруга, Мінская вобласць). Выбраныя намеснікі займаюць месцы за сталом Старшыні Вярхоўнага Савета БССР.

Далей Вярхоўны Савет зацвярджае рэгламент і прымае наступны парадак дня сесіі:

1. Выбары Мандатнай камісіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

2. Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў Беларускай ССР. На гэтаму пытанню вырашана заслухаць два даклады: аб перабудове агульнай сярэдняй адукацыі; аб развіцці вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі.

3. Зацвярджэнне Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

4. Выбранне пастаянных камісій Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

5. Выбранне Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

6. Утварэнне Урада Беларускай ССР — Савета Міністраў Беларускай ССР.

Затым Вярхоўны Савет распачынае разгляд першага пытання парадку дня сесіі — выбары Мандатнай камісіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Па прапанове дэпутата І. К. Косміна, які выступіў па даручэнню Савета старэйшын, сесія выбірае Мандатную камісію Вярхоўнага савета Беларускай ССР у складзе дзевяці чалавек.

Вярхоўны Савет пераходзіць да разгляду наступнага пытання парадку дня сесіі — аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў Беларускай ССР.

Слова для даклада аб перабудове агульнай сярэдняй адукацыі ў Беларускай ССР атрымлівае міністр асветы БССР дэпутат І. М. Ільюшын.

Пасля перапынку з дакладам «Развіццё вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ў рэспубліцы» выступіў старшыня Дзяржплана БССР С. М. Малінін.

Затым Вярхоўны Савет распачынае абмеркаванне дакладаў дэпутатаў І. М. Ільюшына і С. М. Малініна.

Сёння, 8 красавіка, Першая сесія Вярхоўнага Савета БССР працягвае сваю работу.

(БЕЛТА).

І ГЭТЫ РУБЕЖ ТРЭБА ЎЗЯЦЬ!

АДМЕТНАЯ РЫСА рэспубліканскай нарады работнікаў культуры, якая днямі праходзіла ў Мінску, — яе актыўнасць. У адрозненне ад мінулых нарад на гэтай было выказана шмат цікавых прапаноў, прамоўцы абменьваліся думкамі, расказвалі аб вопыце работы. Больш за ўсё гаворка ішла пра тое, як лепш і больш змястоўна прапагандаваць рашэнні XXI з'езду партыі, што трэба рабіць, каб павысіць культуру ў рабоце ўстаноў культуры, каб кожны клуб, бібліятэка, Дом культуры стаў сапраўдным цэнтрам культурна-масавай работы на вёсцы.

ЖЫЦЬ ДУМАМІ І СПРАВАМІ НАРОДА

Гэтая думка пранізвала літаральна кожнае выступленне. Наш народ натхнёна змагаецца за датэрміновае выкананне сямігадовага плана. Рост культуры савецкіх людзей прад'яўляе павышаныя патрабаванні да работнікаў культуры, літаратуры і мастацтва рэспублікі. Нашы тэатры, канцэртныя арганізацыі за апошні час пачалі часцей сустракацца з сельскім гледачом, наладжваюць свае выступленні на фабрыках і заводах, на будоўлях. Так, напрыклад, Тэатр оперы і балету за першы квартал 1959 г. правёў 65 выездаў. Артысты выступалі ў Віцебску, Оршы, Магілёве, у Слуцкім і Старадарожскім раёнах. На вызначных спектаклях і канцэртах пабывала больш 37 тысяч гледачоў.

Але гэтую работу можна было б разгарнуць значна шырэй, каб сельскія ўстановы культуры былі больш прыстасаваны да выступленняў прафесіянальных калектываў. Гэта ж факт, што ў многіх клубах і дамах культуры зімой холадна, павыбіваны вокны.

На нарадзе выказана многа крытычных заўваг у адрас нашых творчых саюзаў — кампазітараў, мастакоў, пісьменнікаў, а таксама тэатраў і канцэртных арганізацый. Старшыня пабудкома Полацкага трэста «Нафтабуд» тав. Сашчанка гаварыў, што на іх вялікай будоўлі паспелі пабываць прадстаўнікі многіх арганізацый і ведамстваў, толькі не было нікога з Міністэрства культуры.

— Мы вельмі ўдзячны калектыву Тэатра оперы і балету, — гаворыць тав. Сашчанка, — за канцэрт, з якім выступіла група акцёраў гэтага тэатра ў нас на будоўлі. Хацелася б, каб іншыя тэатральныя калектывы і асабліва Тэатр імя Якуба Коласа часцей сустракаліся з нашымі рабочымі.

Начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення культуры М. Шаўчук таксама падтрымаў прадстаўніка нафтаперапрацоўчага завода. Рэпертуар калектываў Белдзяржэстрады, якія прыязджаюць у нашу вобласць, гаворыць ён, надзвычай бедны і аднастайны. Канцэртныя брыгады не вельмі ахвотна едуць да сельскага гледача. У аддаленыя раёны — Ленінскі, Целяханскі і іншыя яны гадамі не заязджаюць. На будаўніцтва Бярозаўскай ДРЭС прафесіянальныя артысты не заглядаюць.

Быць бліжэй да жыцця, даць нашаму народу больш твораў на сучасную тэму — на гэта скіраваны цяпер намаганні пісьменнікаў рэспублікі.

— Беларускія літаратары, — сказаў у сваім выступленні адказны сакратар Саюза пісьменнікаў БССР М. Ткачоў, — ахвотна бяруцца за гэтую справу. Многія пісьменнікі паедуць на новабудоўлі нафтаперапрацоўчага завода ў Полацк, Старобінскага калійнага камбіната, Бярозаўскую ДРЭС і ў многія іншыя гарады і вёскі рэспублікі. Вядома, гэта дасць станоўчы вынік. У нас з'явяцца новыя нарысы і публіцыстычныя артыкулы, аповесці і вершы, п'есы і кінасцэнарыі.

Уважліва слухаючы выступленні прамоўцаў, шчыра радуешся, што на нарадзе ішла вялікая размова пра тое, што трэба зрабіць, каб дапамагчы нашай партыі і народу датэрмінова выканаць сямігадовы план. Выказвалася многа цікавых думак і прапаноў. Вось гэтая канкрэтнасць размовы і выклікала жывую рэакцыю залы, устанавіла цесны кантакт паміж прамоўцамі і тымі, хто слухаў.

Кідалася ў вочы і другое: мы не пазбавіліся яшчэ ад той старой, заганнай звычкі, калі з трыбун нашых нарад і сходаў зачытваліся цэлыя старонкі статыстычных зводак, калі за гэтымі лічбамі губляліся жывыя людзі — сапраўдныя творцы вялікіх і малых спраў, якія адбываюцца ў жыцці. Нешта падобнае адчувалася ў выступленні начальніка Гомельскага абласнога ўпраўлення культуры М. Стальмаховай. Валавы падыход да ацэнкі вынікаў працы людзей — гэта не той крытэрый, па якому можна меркаваць аб дасягнутым у той ці іншай галіне культуры ці гаспадаркі.

Пра што сведчаць лічбы, якія прывяла ў сваім выступленні тав. Стальмахова? Установы культуры, гаварыла яна, набылі 129 прыёмнікаў, каля 200 баянаў і г. д. Ці дастаткова гэта? Ці ўсе ўстановы культуры маюць баяны і прыёмнікі? Нічога невядома.

Або вось яшчэ прыклад. Яна расказвала, што ў клубных установах вобласці прачытана больш 25 тысяч лекцый і дакладаў, а ў многіх раёнах прачытана ад 1 200 да 1 500 лекцый. Без сур'ёзнага аналізу гэтыя голыя лічбы, вядома, нікому і нічога не гавораць. Яны хутчэй сведчаць пра тое, што чалавек, які так лёгка імі аперыруе, дрэнна ведае жыццё і практыку работы сваіх устаноў культуры.

Вядома, што такое выступленне выклікала пярэчанне ў старшыні калгаса «Бальшавік» тав. Музыкіна. Ён гаварыў:

— Як паведаміла нарадзе тав. Стальмахова, абласны тэатр у гэтым годзе паставіць 65 вызначных спектакляў у калгасах і саўгасах. Калі гэтая справа будзе працягвацца так і далей і ніякіх істотных змен не адбудзецца, дык наш тэатр за сямігодку набывае ў кожным калгасе вобласці толькі адзін раз. Гэта вельмі і вельмі мала. Зусім іншай увагі заслугоўваюць працаўнікі калгаснай вёскі.

Аб рабоце ўстаноў культуры лепш меркаваць не па лічбах, а па тым, колькі выхавалі яны дастойных людзей.

НАДЗЕЙНЫЯ ПАМОЧНІКІ ПАРТЫІ

— На XXI з'ездзе партыі, — гаварыў міністр культуры СССР М. Міхайлаў, — праблемы культуры займалі важнае месца. Ды гэта і заканамерна. Пытанні эканамічнага будаўніцтва нельга разглядаць без сувязі з культурай.

Прапаганда сямігадовага плана павінна разглядацца кожнай установай культуры не як часовая кампанія, а як вялікая складаная справа, што патрабуе няспынных намаганняў і клопатаў. Наспела цяпер неабходнасць шырэй абагульняць і распаўсюджваць перадавы вопыт, больш настойліва прыцягваць да работы культурна-асветных устаноў інтэлігенцыю, моладзь.

У новай сямігодцы адбудуцца вялікія змены не толькі ў эканамічным, але і ў культурным жыцці савецкіх людзей. Скарочаны рабочы дзень, павышэнне заработнай платы, паляпшэнне жыццёвых умоў працоўных, — хіба гэта не стварае новыя, выключныя магчымасці для таго, каб узмацніць работу на фронце культурнага будаўніцтва. Значыць, не заўтра, а сёння трэба перабудоўваць работу культасветустаноў. Трэба ствараць універсітэты культуры, самадзейныя тэатры і аркестры, арганізоўваць перасоўныя выстаўкі выяўленчага мастацтва. Усю работу ўстаноў культуры трэба будаваць у цеснай сувязі з жыццём саўгаса, калгаса, прадпрыемства.

На XXI з'ездзе партыі ішла гаворка пра тое, каб культурнае абслугоўванне насельніцтва паступова пераходзіла ў рукі грамадскіх арганізацый. Гэта абавязвае нас шырэй выкарыстоўваць дапамогу грамадскасці. Нам трэба дабіцца таго, каб установы культуры дапамаглі народу ў яго стваральнай працы, у яго культурным росце.

Трэба актывізаваць дзейнасць нашых культкамісій пры мясцовых Саветах дэпутатаў працоўных. Гэта ўнясе ў работу ўстаноў культуры большае ажыўленне, новы творчы струмень. Неабходна абмеркаваць пытанне і аб стварэнні пры Міністэрстве культуры рэспубліканскага савета па справах мастацкай самадзейнасці, які займаўся б пытаннямі падрыхтоўкі кадраў, прапагандаваў вопыт лепшых калектываў, клапаціўся пра рэпертуар і г. д. Варта таксама стварыць у рэспубліцы таварыства аматараў кнігі. Яно праводзіла б з'езды бібліятэчных работнікаў, абагульняла б вопыт лепшых і такім чынам прыцягвала большую колькасць людзей да справы прапаганды кнігі.

Нядаўна ў Маскве закончыўся Усесаюзны агляд кінааматараў, на якім прэміі і дыпломы атрымалі 55 фільмаў. Некаторыя з іх стаяць на высокім узроўні, іх можна паказваць у дзяржаўных кінатэатрах. Варта падумаць над тым, каб кіно- і фотааматарства з дапамогай прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый набыло шырокі размах у рэспубліцы. Вельмі важна, каб больш актыўна працавалі ў рэспубліцы тэатральнае і харавое таварыствы.

І яшчэ адно пытанне ўзняў у сваім выступленні тав. Міхайлаў. Ён лічыць неабходным пачаць паход супраць халтуры, якая дае сябе адчуваць у многіх месцах. З аднаго боку, мы праводзім значную работу па камуністычнаму выхаванню людзей, а з другога боку нам перашкаджаюць пошлыя грампласцінкі, антымастацкія рэчы рамеснікаў, якіх так многа напаткаеш на рынках у гарадах і раённых цэнтрах.

Савецкая літаратура і мастацтва, гаворыць у заключэнне М. Міхайлаў, сваім прыкладам паказваюць, якім шляхам трэба ісці, як трэба служыць вялікай справе працоўных, як трэба змагацца за ідэі камунізма. Магчымасці для нашай работы ў нас вельмі вялікія. Партыйныя і савецкія арганізацыі ва ўсім аказваюць работнікам культуры, літаратуры і мастацтва падтрымку. У бліжэйшы час будзе вырашана пытанне аб значным павышэнні заработнай платы кінамеханікаў. Мы павінны згуртаваць, мабілізаваць усе нашы сілы для таго, каб дапамагчы гераічнай Камуністычнай партыі ў яе барацьбе за новыя перамогі ў камуністычным будаўніцтве.

ДБАЦЬ ПРА КУЛЬТУРУ КАЛГАСНАЙ ВЁСКІ

— Цяпер і людзі ў нас не тыя, і вёска не тая, якою яна была пяць—шэсць год назад, — сказаў у сваім выступленні старшыня калгаса «Бальшавік» Гомельскага раёна тав. Музыкін.

І як не пагадзіцца са словамі калгаснага важака, калі мы на кожным кроку адчуваем непазнавальныя змены. Хуткі рост матэрыяльнага дабрабыту калгаснікаў патрабуе, каб гэтак жа хутка расла і культура вёскі. Гэта трэба для таго, каб нашым людзям жылося весела, каб песні, якія любіць беларускі народ, звінелі звонам медзі ў кожнай вёсцы, са сцэн калгасных клубаў, каб народ любіў і чытаў кнігі, каб кожная вольная ад працы хвілінка спрыяла яго ідэйнаму і культурнаму росту.

Калгас «Бальшавік» мае добры прасторны клуб, у якім ёсць стацыянарная кінаўстаноўка і бібліятэка. Адным з самых прыгожых будынкаў вёскі Бабовічы з'яўляюцца яслі. Цяпер калгас будуе новае прасторнае памяшканне для сярэдняй школы.

Вялікія планы намецілі калгаснікі на сямігодку. Акрамя значнага ўздыму ўсіх галін гаспадаркі, многа ўвагі будзе нададзена будаўніцтву культурна-бытавых аб'ектаў. Добра, старанна працуюць калгаснікі. Яны заслужылі права на адпачынак. Для лепшых працаўнікоў калгас пабудуе дом адпачынку. На чарзе будаўніцтва бальніцы і лазні. Ёсць у гэтай вялікай і прыгожай вёсцы электрычнасць, радыё, але няма яшчэ водаправода. Вырашылі калгаснікі к канцу сямігодкі ў кожны дом правесці водаправод.

Як расліна цягнецца да сонца, да святла, так і працаўнікі калгаснай вёскі цягнуцца да культуры, да ведаў. Яны хочуць глядзець усе новыя кінафільмы і спектаклі нашых тэатраў, слухаць канцэрты. Калгаснікі сельгасарцелі «Бальшавік» два разы ў месяц прыязджаюць у Гомель на спектаклі свайго абласнога тэатра. Яны былі б вельмі ўдзячны тэатру, каб ён, хоць бы два—тры разы ў год прыязджаў у наш калгас, гаворыць старшыня.

Пра бурны рост культуры калгаснай вёскі гаварыў на нарадзе і старшыня калгаса «Чырвоны пуцілавец» Старобінскага раёна М. Сергіевіч. Сваімі ўласнымі сіламі пабудаваў калгас з саману добры клуб на 350 месц і сямігадовую школу, набыў камплект інструментаў для духавога аркестра. А колькі людзей збіраецца цяпер, каб паслухаць калгасных музыкантаў! Як хораша танцаваць моладзі пад музыку духавога аркестра!

— Клуб у вёсцы Прусы стаў цэнтрам, які збірае вакол сябе не толькі моладзь, але і пажылых калгаснікаў, — расказвае старшыня.— Працуюць самадзейныя гурткі. Ахвотна наведваюць калгаснікі кіно. Вялікай падзеяй у культурным жыцці калгаса з'явілася адкрыццё музычнай школы, у якой вучыцца 60 дзяцей хлебаробаў нашага раёна.

Многія прамоўцы, якія выступалі на нарадзе, гаварылі аб тым, што будаўніцтва клубаў на вёсцы з кожным годам пашыраецца. Але лягчэй пабудаваць новы клуб, чым дастаць добры праект для клуба. Пытанне гэтае не вырашана і сёння. І клубы будуюць хто як можа і хоча. Падобная «самадзейнасць» прыносіць нямала шкоды, бо многія клубы не маюць пакояў для акцёраў, у іх малыя сцэны, на якіх нават самадзейным артыстам цяжка выступаць. Міністэрства культуры не павінна быць у гэтай справе староннім назіральнікам. Яго кроўная справа — цікавіцца тым, як будуюцца клубы ў калгасах.

Калі мы хочам, каб клуб наведвалі калгаснікі, трэба клапаціцца, каб у ім было чыста, утульна. Як правільна адзначалі многія прамоўцы, пра гэта мала дбаюць у нас і сельсаветы і праўленні калгасаў.

Загадчыца Пашкаўскага сельскага клуба Магілёўскага раёна П. Смятаніна гаварыла, што цяжка ўтрымліваць у клубе чысціню, калі прыбіральшчыца мае толькі паўстаўкі, не хапае сродкаў для таго, каб належным чынам аформіць памяшканне клуба лозунгамі, плакатамі і г. д. Ва ўстановах культуры не хапае мэблі і вельмі цяжка яе набыць.

Нават калі і ёсць сродкі, не заўсёды зробіш на іх тое, што трэба. На нарадзе прыводзіўся такі факт. У мінулым годзе кіраўніцтва «Нафтабудтрэста» адпусціла прафсаюзнай арганізацыі 50 тысяч рублёў на набыццё касцюмаў для ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Куды ні звярталіся гурткоўцы — і ў Полацк, і ў Віцебск, і нават у Мінск, нідзе не знайшлося такой арцелі, якая б выканала заказ рабочых такой вялікай будоўлі. Так гэтыя грошы і не давялося выкарыстаць. Тое ж самае здараецца і з калгаснай самадзейнасцю. Таму многа ў нас у гэтай справе прымітывізму.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

У прэзідыуме СП БССР

Прэзідыум праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі вырашыў правесці ў першай палове мая рэспубліканскую нараду маладых пісьменнікаў. На нараду будуць запрошаны паэты, празаікі, драматургі — члены абласных і раённых літаратурных аб'яднанняў. З дакладамі аб становішчы і развіцці беларускай літаратуры, аб падрыхтоўцы да Трэцяга Усесаюзнага з'езду пісьменнікаў выступяць крытык Ул. Юрэвіч, празаікі І. Грамовіч і І. Навуменка.

На пасяджэнні прэзідыума абмеркаваны перспектыўны план Вучэбна-пед

І ГЭТЫ РУБЕЖ ТРЭБА ЎЗЯЦЬ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Даўно наспела пытанне адкрыць у рэспубліцы спецыяльную майстэрню, якая займалася б пашывам касцюмаў для самадзейнасці.

Многія нашы клубы не маюць музычных інструментаў — баянаў, акардэонаў, піяніна і г. д. Часам жа, калі і пашанцуе іх набыць, дык зноў не парадуешся. Так здарылася ў Гомельскай вобласці. Набылі ў мінулым годзе сем баянаў вытворчасці Маладзечанскай фабрыкі гармонікаў. Граць на іх цельга было — адразу адаслалі ў рамонт.

ПРА ТОЕ, ШТО НАЙБОЛЬШ НАБАЛЕЛА

Каб хутчэй наблізіць прыход камуністычнага грамадства, трэба ўжо сёння выхоўваць чалавека гэтай блізкай цудоўнай будучыні—павышаць яго ідэйны і культурны ўзровень, выхоўваць камуністычныя адносіны да працы.

Аднадушная думка ўсіх прамоўцаў зводзілася да таго, што існуючая сістэма падрыхтоўкі кадраў устарэла і не адпавядае сучасным патрабаванням, што аддзел кадраў Міністэрства культуры ў гэтай справе адстае ад жыцця. Выпускнікі культасветвучылішчаў, гаворыць начальнік Мінскага абласнога ўпраўлення культуры І. Сяргейчык, дрэнна падрыхтоўваюцца да практычнай дзейнасці. У іх дыпломах сказана, што яны з'яўляюцца арганізатарамі клубнай работы. Але цяжка быць арганізатарам, калі сам не ведаеш нот, не ўмееш іграць ні на адным музычным інструменце.

Патрабуе перабудовы і выкладанне ў музычных вучылішчах. Там, як правіла, рыхтуюць выкладчыкаў для музычных школ, а многія выпускнікі ідуць працаваць выключна ў музычныя ўстановы, і ніхто з іх не жадае быць мастацкім кіраўніком Дома культуры. Неабходна так перабудаваць работу навучальных устаноў Міністэрства культуры, каб яны рыхтавалі сапраўдных арганізатараў клубнай і бібліятэчнай работы, кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці. Вельмі слушнай была прапанова аб тым, каб адкрываць новыя музычныя ўстановы ў сельскай мясцовасці. Хто скончыць гэтыя ўстановы, ахвотна будзе працаваць у калгасах і саўгасах.

Міністэрству культуры варта паклапаціцца і пра сістэматычную вучобу і павышэнне ведаў работнікаў органаў культуры. Неаднаразова ўзнімалася пытанне аб адкрыцці ў Мінску інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры. На вялікі жаль, яно яшчэ не вырашана, хоць патрэба ў такім інстытуце надзвычай вялікая.

XII Пленум ЦК КПБ надаў сур'ёзную ўвагу пытанню падрыхтоўкі кіраўнікоў для мастацкай самадзейнасці. Пленум абавязаў Міністэрствы сельскай гаспадаркі і культуры, Белпрамсавет, Беларускі Савет прафсаюзаў, Саўнаргас за лік сродкаў прадпрыемстваў і калгасаў штогод рыхтаваць на курсах 1 500 баяністаў, кіраўнікоў харавых калектываў і самадзейных артыстаў. Але аб выкананні гэтага рашэння клапоцяцца толькі органы культуры, іншыя арганізацыі пра яго не дбаюць.

Народны артыст СССР Р. Шырма прапануе па прыкладу Ленінграда, Кіева, Масквы стварыць у Мінску харавое вучылішча для найбольш здольных хлопчыкаў. Гэта намнога павысіць харавую культуру ў рэспубліцы. Мы не можам мірыцца з тым, што многія добрыя і здольныя харавыя калгасныя калектывы занялі. Так здарылася з Улукаўскай капелай (Гомельскі раён), Прыбараўскім хорам (Брэсцкі раён). У рэспубліцы не хапае кваліфікаваных кіраўнікоў, і таму работа з самадзейнымі калектывамі носіць выпадковы характар, звычайна іх дзейнасць актывізуецца напярэдадні агляду ці Дэкады самадзейнага мастацтва.

У Клімавіцкім раёне Магілёўскай вобласці добра наладжана абслугоўванне сельскага кінагледача. Неаднаразова ён атрымліваў прэміі за перавыкананне плана.

На здымку: удзельнік рэспубліканскай нарады работнікаў культуры загадчык аддзела культуры Клімавіцкага раёна П. Алаеў (злева) расказвае аб вопыце сваёй работы загадчыкам аддзелаў культуры М. Шчарбакову (Хоцімск), Л. Ступіну (Чавусы), М. Іванову (Быхаў).

Многія прамоўцы з трывогай адзначалі, што і ў нашых тэатрах, і ў калектывах мастацкай самадзейнасці адчуваецца востры недахоп у рэпертуары, які б адлюстроўваў гераічныя намаганні савецкага народа за пабудову камуністычнага грамадства. Справа за вамі, таварышы пісьменнікі і кампазітары. Гэта ваш пачэсны абавязак.

Начальнік рэспубліканскай канторы Саюздрук М. Кусаў і іншыя прамоўцы гаварылі аб тым, што работнікі культуры Беларусі абавязаны самі чытаць, выпісваць і шырока прапагандаваць такія перыядычныя выданні, як часопісы «Полымя», «Советская Отчизна», газета «Літаратура і мастацтва».

ПАЧЭСНЫЯ ЗАДАЧЫ

— Высокае прызванне ўстаноў культуры, — гаворыць сакратар ЦК КП Беларусі Ц. Гарбуноў, — дапамагаць партыі выхоўваць працоўных у духу камунізма, поўнасцю задавальняць усё ўзрастаючыя запатрабаванні савецкага чалавека. У рабоце ўстаноў культуры ёсць нямала станоўчых прыкладаў. Многа цікавых мерапрыемстваў праводзіцца па прапагандзе матэрыялаў XXI з'езду КПСС. У рэспубліцы працуюць нямала ініцыятыўных людзей, якія любяць сваю скраву, аддаюць ёй усю энергію і сілы.

Тав. Гарбуноў гаворыць і пра недахопы ў рабоце ўстаноў культуры. Ён лічыць, што істотным недахопам з'яўляецца ўсё яшчэ нізкі ідэйна-тэарэтычны ўзровень культасветработы. Недастаткова ўвагі надаецца зместу работы, папулярнасці і дзейснасці лекцый і гутарак, нагляднай агітацыі. Часта прапаганда рашэнняў XXI з'езду вядзецца ў адрыве ад жыцця, ад канкрэтных задач прадпрыемстваў, калгасаў, устаноў і ведамстваў.

Велічныя задачы камуністычнага будаўніцтва патрабуюць карэнным чынам палепшыць ідэалагічную работу сярод працоўных. Неабходна шырока выкарыстаць усе формы масава-палітычнай і культурна-асветнай работы: сходы працоўных, гутаркі, даклады, лекцыі, кіно, радыё.

КАЛІ ІНІЦЫЯТЫВА Б'Е КРЫНІЦАЙ

Шырокія магчымасці адкрываюцца перад установамі культуры рэспублікі. Толькі працуй, шукай новыя формы і метады работы, а недахопу ва ўдзячных памочніках і слухачах ніколі не будзе. Штодзень нараджаецца ў нас новае і цікавае ў рабоце клубаў, бібліятэк, кінамеханікаў. І трэба ўважліва збіраць гэтыя каштоўныя россыпы народнай ініцыятывы, як мага шырэй прапагандаваць іх і распаўсюджваць.

Вядома, што маладосці найбольш уласцівы гэты творчы неспакой і калі б усе ўстановы культуры будавалі сваю работу ў цеснай сувязі з камсамолам і моладдзю, мясцовай інтэлігенцыяй — многа цікавых і выдатных спраў нарадзілася б у нас. У мінулым годзе камсамол Беларусі аб'явіў паход за культуру. Якая гэта высакародная задача! Мэта гэтага паходу — палепшыць культурна-масавую работу, добраўпарадкаваць свае ўстановы культуры. Добра папрацавалі камсамольцы Берастовіцкага, Слуцкага, Кіраўскага і іншых раёнаў. Пры іх актыўным удзеле ў рэспубліцы пабудавана 506 калгасных клубаў.

А зусім нядаўна камсамольцы калгаса імя Кірава Слуцкага раёна правялі новую ініцыятыву. Яны сур'ёзна бяруцца за садоўніцтва. Яны пасадзяць новы сад імя сямігодкі. Поспехаў вам, маладыя энтузіясты. Упрыгожым нашу Радзіму садамі, паркамі, кветкамі, няхай добра і радасна жывецца ў ёй нашаму чалавеку — будаўніку камуністычнага грамадства.

А колькі выдумкі, ініцыятывы ў працы праявілі ўстановы культуры Навагрудскага, Чавускага, Баранавіцкага і іншых раёнаў. З дапамогай камсамольцаў тут праводзяцца цікавыя тэматычныя вечары.

— Нам трэба пазбягаць фармалізму ў рабоце ўстаноў культуры, — гаварыла сакратар ЦК ЛКСМБ Н. Краснова. — Што можа даць працаўніку калгаснай вёскі хатачытальня, накшталт той, якая працуе на тэрыторыі калгаса імя Суворава Кобрынскага раёна? У ёй, акрамя плакатаў «Знішчайце мух і каларадскага жука», нічога няма.

* * *

Вялікая і цікавая размова адбылася на рэспубліканскай нарадзе работнікаў культуры. Цяпер справа за тым, каб міністэрства і органы культуры ўважліва вывучылі ўсе прапановы, якія былі выказаны тут, і ажыццявілі іх.

Несці ў масы культуру і веды, дапамагаць народу ў яго стваральнай працы, выхоўваць савецкіх людзей у камуністычным духу—пачэсны абавязак работнікаў культуры, мастацтва і літаратуры нашай рэспублікі. І гэты рубеж будзе ўзяты!

Музычныя лекторыі

Лекцыяй-канцэртам «Як слухаць і разумець музыку» пачаў сваю работу музычны лекторый пры Беларускай кансерваторыі, створаны для кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці Мінска і вобласці.

Лектар — старшы выкладчык кансерваторыі К. Сцепанцэвіч падрабязна спынілася на ролі музыкі ў грамадстве, закранула структуру музычных твораў, іх жанравасць, асвятліла пытанні праграмнасці музычнага мастацтва. Сваю лекцыю К. Сцепанцэвіч суправаджала ўласнымі ілюстрацыямі. Яна сама спявала і іграла ўрыўкі з музычных твораў рускіх, зарубежных класікаў і беларускіх аўтараў.

Пасля заканчэння лекцыі для слухачоў лекторыя быў дадзены вялікі канцэрт. У першым аддзяленні сімфанічны аркестр кансерваторыі (дырыжор — заслужаны дзеяч мастацтва І. Гіттарц) выканаў два творы Мендэльсона — увертюру «Фінгалава пячора» і першую частку канцэрта для скрыпкі з аркестрам (саліст — педагог кансерваторыі М. Гальдштэйн).

У другім аддзяленні выступілі педагогі кансерваторыі — піяністка В. Жубінская і вакалістка В. Фамічэнка. В. Жубінская сыграла мі-мажорны санет Пятраркі і парафразы «Рыгалета» Ліста; В. Фамічэнка праспявала рамансы «Ноч» Чайкоўскага і «Даўно ў любві» Рахманінава (партыю фартэпіяна выконваў В. Шэліхін). У канцэрце выступілі таксама аркестр народных інструментаў пад кіраўніцтвам Г. Жыхарава і студэнты-вакалісты М. Пушкароў і В. Гур'еў.

Адкрыццё музычнага лекторыя пры кансерваторыі зацікавіла рабочую моладзь сталіцы. Яшчэ да пачатку яго работы дырэктарамі клубаў і навучальнай часткай кансерваторыі было раздадзена больш паўтары тысячы абанементаў.

У красавіку і маі адбудуцца лекцыі-канцэрты «Песенная творчасць народа», «Сусветнае значэнне рускай класічнай музыкі», «Савецкая музычная культура», «Музычная культура Савецкай Беларусі».

Л. НАУРОЦКІ.

* * *

Пачаў работу музычны лекторый, арганізаваны пры Стаўбцоўскім Доме культуры. «Нам песня будаваць і жыць памагае» — гэтай тэме прысвечана першая лекцыя-канцэрт, якая адбылася днямі. Лекцыю прачытаў музыказнаўца І. Нісневіч. Вакальныя творы беларускіх і савецкіх кампазітараў выканалі К. Ясінская, В. Фамічэнка, Ю. Матраеў і М. Пігулеўскі.

—●—

Стацыянарная выстаўка

У Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі адкрыта стацыянарная выстаўка, якая расказвае пра сямігодку вобласці. Мноства матэрыялаў апавядае пра далейшы магутны ўздым прамысловасці і сельскай гаспадаркі, пра паляпшэнне дабрабыту працоўных.

Асабліва падоўгу затрымліваюцца наведвальнікі каля дыяграм і матэрыялаў, якія расказваюць пра развіццё культуры ў наступіўшым сямігоддзі. Ужо сёлета ў Брэсце, Пінску і сямі раённых цэнтрах уступяць у дзеянне новыя кінатэатры, у горадзе Століне і пасёлку Шарашова Пружанскага раёна будуць пабудаваны дамы культуры, у вёсцы Астрамечава Брэсцкага раёна — будынак сельскай бібліятэкі.

За сямігоддзе намечана ўвесці ў строй будынкі абласной бібліятэкі і друкарні. Ва ўсіх калгасах вобласці будуць устаноўлены кінастацыянары, а ў паляводчых брыгадах пабудаваны клубы.

Н. КОЛАЎ.

НАСУСТРАЧ III З'ЕЗДУ КАМПАЗІТАРАЎ БССР

Жывая гісторыя народа

Народная песня... Колькі пачуцця ўклалі ў яе невядомыя стваральнікі! Яна — люстэрка жыцця, жывая гісторыя народа, вывучаючы якую, можна зразумець яго думы, пранікнуць у яго сэрца. Яна — крыніца творчага натхнення кампазітара. Творчае авалоданне народным музычна-тэматычным матэрыялам, у першую чаргу народнай песняй — важнейшая ўмова народнасці прафесіянальнай музычнай культуры. Умова гэта ніколькі не абмяжоўвае кампазітара, не звужае яго творчай фантазіі, не адбірае ў яго права ствараць уласныя яркія мелодыі. Наадварот, яна пашырае поле дзейнасці кампазітара, дапамагае яму ў творчых пошуках, дае багатую глебу для натхнення, садзейнічае пераадоленню суб'ектывізма музычнага мыслення.

Вось чаму народная творчасць — прадмет пільнага вывучэння савецкага музыказнаўства, асабліва такой яго галіны, як музычная фальклярыстыка.

Не застаюцца ў даўгу перад грамадскасцю і музычныя фалькларысты Беларусі. Больш таго, можна смела сказаць, што іменна гэтая галіна музыказнаўчай навукі ў нашай рэспубліцы стала вядучай. Многа год з любоўю збіраюць, вывучаюць і прапагандуюць беларускую народную песню такія вядомыя дзеячы савецкай музычнай культуры, як Р. Шырма, Г. Цітовіч. Энтузіяст сваёй справы Л. Мухарынская пабывала ўжо ва ўсіх абласцях БССР, як і многія іншыя музыказнаўцы і кампазітары.

Кожнае лета Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, Саюз кампазітараў БССР, Беларуская кансерваторыя арганізуюць фальклорныя экспедыцыі ў розныя раёны рэспублікі. Удзельнікі экспедыцый прывозяць каштоўны матэрыял — нотныя запісы, фанаграмы, магнітафонныя стужкі, якія расшыфроўваюцца, вывучаюцца. На падставе іх затым рыхтуюцца да выдання зборнікі беларускіх народных песень.

Аднак раней гэтая работа ў нас вялася неарганізавана. Кожная арганізацыя пры распрацоўцы маршруту экспедыцый і выбару пунктаў запісу народных песень дзейнічала самастойна. Пры гэтым аказвалася, што маршрут адной экспедыцыі іншы раз паўтараў маршрут другой у той час, калі на музычна-фальклорнай карце Беларусі яшчэ многа белых плям. Нідзе і нікім не каардынавалася і навукова-даследчая работа ў галіне беларускага музычнага фальклору.

Таму беларускія музыказнаўцы адгукнуліся на ініцыятыву Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР каардынаваць работу музычных фалькларыстаў рэспублікі. У нарадзе, якая адбылася ў Акадэміі навук БССР прынялі ўдзел музыказнаўцы Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Саюза кампазітараў БССР, Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, прадстаўнікі музычных вучылішчаў Магілёва і Гродна.

Ва ўступным слове дырэктар Інстытута акадэмік П. Глебка расказаў аб матах і задачах нарады, пазнаёміў прысутных з работай, якая вядзецца ў інстытуце па зборы і вывучэнню беларускай народнай творчасці, слоўнай і музычнай, па падрыхтоўцы да выдання фальклорных зборнікаў. На нарадзе абмеркаваны практычныя пытанні, звязаныя з арганізацыяй вывучэння беларускай народнай творчасці, пастаўлены некаторыя тэарэтычныя праблемы фальклярыстыкі.

Р. Шырма, Г. Цітовіч, Л. Мухарынская, М. Грынблат узнялі пытанне аб неабходнасці ўважліва вывучаць своеасаблівасць народнай творчасці ў розных месцах Беларусі. Нягледзячы на агульныя асновы, уласцівыя беларускай народнай песні ў цэлым, песні цэнтральных раёнаў адрозніваюцца, скажам, ад тых, што бытуюць на Віцебшчыне, песні ўсходніх абласцей, якія маюць агульныя рысы з рускімі, у той жа час характэрныя сваімі спецыфічнымі ладавымі, рытмічнымі, стылістычнымі і іншымі асаблівасцямі, а песні поўдня Беларусі маюць многа агульнага з украінскімі і г. д. Музыказнаўцы гавораць нават аб наяўнасці нейкай своеасаблівай мяжы, якая раздзяляе паўночныя раёны Беларусі, дзе больш распаўсюджана аднагалоснае спяванне, і паўднёвыя, у якіх развіта шматгалоссе. У якой ступені абгрунтаваны такі падзел, чым ён выкліканы гістарычна, чаму, напрыклад, у паўночнай частцы больш распаўсюджаны традыцыйныя песенныя жанры, звязаныя са старажытнымі абрадамі, а ў паўднёвай частцы пераважаюць іншыя жанры? Толькі ў садружнасці вучоных сумежных галін ведаў — этнографаў, фалькларыстаў-славеснікаў і музыказнаўцаў — можна высветліць прычыны гэтых і многіх іншых цікавых з'яў.

На здымку: група ўдзельнікаў нарады музычных фалькларыстаў.

Аб неабходнасці кантакту работнікаў трох спецыяльнасцей гаварылі на нарадзе І. Гутараў, А. Залескі, К. Кабашнікаў, В. Елатаў.

Вельмі цікавы факт узаемнага ўплыву рускай і беларускай музычных культур, наяўнасць беларуска-ўкраінскіх песенных сувязей. Аб гэтым гаварылі Г. Цітовіч, Л. Мухарынская, Л. Фёдараў. Трэба ўлічваць не толькі ўплыў на беларускую народную песню рускай, украінскай, польскай і іншых песенных культур, але і тое, што яна сама ў значнай меры паўплывала на іх (асабліва гэта адчувальна ў раёнах, якія мяжуюць з Беларуссю).

У гэтай сувязі асабліва цікавых вынікаў можна чакаць ад комплекснай экспедыцыі па Дняпры, якая плануецца на гэтае лета фалькларыстамі Масквы, Кіева і Мінска.

Актуальную праблему закрануў В. Елатаў. Ён гаварыў аб асаблівасцях фальклору, які ствараецца ў нашы дні. Калі да апошняга часу абавязковымі прыкметамі народнай творчасці лічыліся яе вуснасць, адсутнасць аўтара і варыянтнасць, то зараз жыццё ўносіць у гэтае становішча некаторыя карэктывы. Павышэнне агульнага культурнага ўзроўню народа, ліквідацыя непісьменнасці, пільнае вывучэнне спецыялістамі працэсаў нараджэння сучаснага фальклору—усё гэта абумовіла змену прыкмет, характэрных для народнай творчасці ў мінулым. Вызначыць іх — агульная задача славеснікаў і музыкантаў.

Многа ўвагі нарада ўдзяліла пытанню выпрацоўкі адзінай методыкі ў сістэме запісаў. Група спецыялістаў на чале з Р. Шырмам даручана ў бліжэйшы час распрацаваць праграму-апытальнік у дапамогу аматарам беларускай народнай творчасці як прафесіяналам, так і аматарам. У дапаможніку павінен быць абагульнены багаты вопыт найбуйнейшых спецыялістаў. Сучасным дапаможнікі, якімі кіруюцца савецкія фалькларысты, пры ўсёй іх каштоўнасці, не могуць, натуральна, улічваць своеасаблівасці запісвання народнай творчасці ў Беларусі, навова ўмовах таго ці іншага яе раёна. Наперадзе вялікая работа і ў галіне стварэння адзінай навуковай тэрміналогіі, якой маглі б карыстацца музыказнаўцы.

Асаблівых клопатаў патрабуе вывучэнне і захаванне ўзораў беларускай народнай інструментальнай музыкі. Імправізацыйныя віртуозныя наігрышы народных скрыпачоў, рэдкія папаўсюджаныя ў Беларусі ў недалёкім мінулым, цяпер паступова губляюць. Іх трэба з асаблівай старанасцю вышукваць і запісваць. Гэта мае навукова-гістарычную і жыццёва творчую цікавасць. Вялікая трывога аб стане вывучэння народнай інструментальнай музыкі прагучала ў выступленнях І. Благавешчанскага, Р. Шырмы, І. Гутарава, Л. Фёдарава.

Не абмяжоўваецца вывучэнне фальклору сельскай мясцовасці, запісваць народную творчасць горада, перш за ўсё рабочага асяроддзя, заклікаў М. Грынблат.

Для плённага вывучэння музычнай творчасці беларускага народа неабходна стварэнне ў Мінску музычна-фальклорнага кабінета з абсталяванай лабараторыяй, з навейшай гуказапісваючай апаратурай, с штатам (няхай невялікім спачатку) сваіх супрацоўнікаў. Мэтазгодна было б стварыць такі кабінет пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Нашы музыказнаўцы павінны вывучыць вопыт арганізацыі гэтай работы Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі, у бліжэйшых саюзных рэспубліках — на Украіне, у Латвіі і Эстоніі. Добра арганізавана справа збору, вывучэння і выдання музычнага фальклору ў Венгрыі, Чэхаславакіі і Балгарыі. Было б карысна запазычыць і гэты вопыт.

Нарада выбрала камісію пад старшынствам Г. Цітовіча для каардынавання ўсёй работы музычных фалькларыстаў рэспублікі. Вырашана штогод праводзіць сустрэчы музыкантаў-фалькларыстаў для выпрацоўкі плана экспедыцый і падвядзення вынікаў работы.

Нарада ў Акадэміі навук—першы крок да аб'яднання музыкантаў-фалькларыстаў Беларусі.

А. ЛАДЫГІНА.

Кніга пра беларускі тэатр

У гісторыі развіцця культуры беларускага народа вялікую ролю адыграў тэатр як найбольш даходлівая форма эмацыянальнага ўплыву на масы, выхавання ў іх ідэі сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення і эстэтычных густаў. У наш час, дзякуючы цеснай сувязі тэатра з жыццём народа, вернасці прынцыпам сацыялістычнага рэалізма, тэатр набывае яшчэ большае значэнне ў справе мастацкай прапаганды перадавых ідэй нашай партыі, барацьбы за пабудову камуністычнага грамадства.

Уладзімір Няфёд у кнізе «Беларускі тэатр» робіць грунтоўную спробу абагульніць шматвяковую гісторыю беларускага драматычнага тэатра, аддаючы асноўную ўвагу развіццю прафесіянальнага тэатральнага мастацтва ў рэспубліцы за гады Савецкай улады.

Кніга зробіць карысную справу як дапаможнік не толькі для студэнтаў тэатральных інстытутаў, але і для ўдзельнікаў шматлікіх самадзейных гурткоў. Яе з цікавасцю прачытаюць усе аматары тэатральнай справы, бо яна дае багата каштоўнага гістарычнага матэрыялу. Аўтар вывучыў нешматлікія матэрыялы па гісторыі дарэвалюцыйнага беларускага тэатра і абагульніў іх. Асноўнае месца ў кнізе заняло апісанне і аналіз работы савецкага тэатра. Вядома, што толькі Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя, якая прынесла беларускаму народу сацыяльную і нацыянальную свабоду, адкрыла шырокія шляхі і для стварэння нацыянальнага тэатра на поўнай прафесіянальнай і дзяржаўнай аснове.

Мудрае кіраўніцтва Камуністычнай партыі, штодзённыя клопаты савецкага ўрада аб развіцці нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зместу культуры дапамаглі беларускаму народу стварыць тэатральнае мастацтва, шырока вядомае ў сваіх лепшых здабытках далёка за межамі рэспублікі. Выяўленне таленавітых майстроў сцэны, сярод якіх і народныя артысты Савецкага Саюза, — жывое сведчанне здольнасцей беларускага народа, яго багатай творчай душы.

Мастацтва тэатра — жывы творчы працэс. Аднак, для таго, каб спазнаць мастацтва сённяшняга дня, нам трэба ведаць яго гісторыю, вытокі тых працэсаў, якія на працягу вякоў фармавалі творчасць. Скажам, для таго, каб глыбока спазнаць народнасць савецкага тэатра, трэба вывучыць, выходзячы з гісторыі тэатра нашага народа, скамарошныя і валачобніцкія гульні, кірмашовы і сядзібны тэатры, тэатральнае аматарства дарэвалюцыйных гадоў і паслярэвалюцыйную самадзейнасць.

Буржуазныя гісторыкі вельмі мала ўвагі ўдзялялі тэатрам відам мастацтва. Яно было справай простага працоўнага народа і сваім баявым зместам заўсёды накіроўвалася супраць эксплуататарскіх класаў. Не дзіва, што слова «балаган» з'явілася сінонімам усяго нізкапробнага, абразлівага. Буржуазія і да гэтага часу лічыць цырк плебейскім мастацтвам, відовішчам для простага народу. А між тым якраз у цыркавых інтэрмедыях, у балаганнай буфанадзе некалі заўсёды востра, у дасціпнай і зразумелай народу форме выкрываліся заганы буржуазнага грамадства, крытыкаваліся асновы эксплуататарскага ладу. Лірнікі, гусляры, скамарохі, пераходзячы з вёскі ў вёску, неслі ў гушчы народа палітычную навіну, бунтарскае слова праўды, заклікалі да пратэсту супраць прыгнёту.

Вядома, аднаму чалавеку цяжка ахапіць і дакладна асвятліць усе найбольш цікавыя з'явы ў творчым жыцці народа. Кніга Ул. Няфёда ў гэтым сэнсе — толькі першая цаглі на. Будучыя гісторыкі беларускага тэатра яшчэ не раз звернуцца да вывучэння нацыянальнага таленту народа, які праяўляўся шматгранна, хоць беларускі народ у мінулым і не меў сваёй дзяржаўнасці, а развіццё яго культуры не з'яўлялася дзяржаўным актам, як у наш час.

Нам думаецца, што кірмашовы тэатр з яго баявой палітычнай драматургіяй, накшталт агульнаславянскіх п'ес «Цар Ірад», «Лодка» ці «Цар Максімільян», а пазней сядзібны тэатр, які даў двух такіх выдатных дзеячоў сцэны, як В. Дунін-Марцінкевіч і І. Буйніцкі, зрабілі куды большы ўплыў на развіццё народнага беларускага тэатра, чым школьная драма, хаця яна і вылучыла такога выдатнага для свайго часу драматурга, як Сімяон Полацкі, пра якога Ламаносаў сказаў, што яго «Рыфмаваная псалтыр», побач з «Граматыкай» Смятрыцкага і «Арыфметыкай» Магніцкага, была варотамі яго вучонасці. Узначаліўшы ў 1663 г. справу кіраўніцтва асветай у Расіі, Сімяон Полацкі не толькі сам пераехаў у Маскву, але і перавёз туды вялікую групу акцёраў Полацкай школьнай драмы, дзе разам з вучнямі заіконаспаскай школы і стварыў тэатр.

У кнізе Няфёда відавочна перабольшваецца роля лялечнага тэатра «Батлейкі» ў развіцці нацыянальнага тэатра, хаця «Батлейка» дажыла і да нашага часу, і жыхары, скажам, Камароўкі ў Мінску маглі яе бачыць і чуць яшчэ нават у пачатку дваццатых гадоў нашага стагоддзя. А батлеечныя тэксты мне, разам з дырэктарам тэатра Юнага гледача Ул. Стэльмахам і пісьменнікам Іларыем Барашкам, давялося чуць некалькі гадоў таму назад ад яго бацькі Мацвея Барашкі, які іх добра помніў.

Вядома, свецкія інтэрмедыі «Батлейкі», калі яны з рук царкоўнікаў перайшлі ў народ, мелі часам і вострыя сацыяльны сэнс, высмейваючы паноў, ураднікаў ды розных махляроў, спачуваючы беднаму прыгнечанаму люду. Але яны, уласна кажучы, толькі вар'іравалі ўсе тыя ж матывы, што даўно былі вядомы ў народнай драме, якая выступала ў жывым выкананні на кірмашах.

Ніякага ўплыву на беларускі народны тэатр не зрабіў і панскі тэатр часоў прыгону, хоць ён і дапамог вылучэнню шмат якіх вядомых акцёраў, музыкаў, мастакоў, танцораў з прыгонных сялян. Пазбаўлены нацыянальнай своеасаблівасці, пабудаваны цалкам як эпігон замежнага тэатра, які не дапускаў пранікнення на сваю сцэну ўсяго мужыцкага, панскі тэатр застаўся забавай для паноў.

Беларускі народны тэатр няспынна ішоў сваёй дарогай, мінуючы панскія палацы. У свята альбо ў час вялікіх кірмашоў майстры народнага мастацтва збіраліся ў групы і давалі свае выступленні на плошчах гарадоў ці ў парках. Аднак пасля падаўлення сялянскага паўстання 1863 г. царскія ўлады пачалі забараняць гэтыя выступленні і праследаваць іх удзельнікаў. Тады народныя майстры мастацтва пачалі збірацца і рыхтаваць свае праграмы на сядзібах, у фальварках. Часцей за ўсё ядром аматараў гэтай справы з'яўлялася якая-небудзь таленавітая сям'я. Так узнік тэатр В. Дуніна-Марцінкевіча, у якім гарачы ўдзел браў ён сам, яго дзве дачкі і іншыя члены сям'і і суседзі. Так узнік і тэатр Ігната Буйніцкага, які пачаў свае канцэрты ў фальварку Палівачы, дзе жыла сям'я Буйніцкіх, жонка і дзве дачкі, якія і склалі аснову творчага гуртка Буйніцкага. Цікава, што і пазней некаторыя тэатры ў Беларусі да рэвалюцыі фарміраваліся такім жа чынам. У трупе Ул. Галубка, апрача яго самога, бралі ўдзел яго маці, жонка і дзеці. Флярыян Жлановіч выступаў у Першым таварыстве беларускай драмы і камедыі разам са сваім братам Антуком, жонкай — актрысай Пралескай, дачкой Ірынай — зараз народнай артысткай БССР.



Трупе Ігната Буйніцкага давялося адыграць выдатную ролю ў развіцці беларускага народнага тэатра, у пранікненні з нацыянальным мастацтвам у самыя гушчы народных мас. Хоць царская канстытуцыя 1905 г. і дазволіла беларусам карыстацца сваёй мовай, аднак на вёсцы, дзе ўсё яшчэ поўнымі гаспадарамі былі пан, поп і ўраднік, мала хто лічыўся з гэтым. Як піша адзін з удзельнікаў трупы Буйніцкага — Рагоўскі, часам здаралася і так: станавы прыстаў, у якога трэба было браць дазвол на выступленні, пытаўся:

— Які такі тэатр?

— Беларускі!

— На якой мове іграеце?

— На беларускай.

— Гэта на мужыцкай? Нельга. Не мужыцкая гэта справа — тэатр.

Каб знайсці выхад са становішча, вырашылі пайсці на хітрыкі, сведчыць Рагоўскі, і ў другой вёсцы на пытанне начальства: «На якой мове іграеце?» уся трупа хорам адказвала: «На балгарскай!»

Жандарскі ротмістр разводзіў рукамі і дазваляў.

Але звычайна пасля выступлення Буйніцкага выклікалі да мясцовага начальства і рабілі суровы допыт: «Чые п'есы ігралі? Чые вершы дэкламавалі? Надрукаваныя яны ці ў рукапісу? Па сваёй волі чыталі альбо прасіў хто?» І ў заключэнне раілі, каб пазбегнуць непрыемнасцей, больш гэтага не рабіць і наогул заняцца чым-небудзь больш богапрыстойным.

Пры ўсёй той вялікай ролі, якую адыграў Ігнат Буйніцкі ў справе развіцця беларускага народнага тэатра, наўрад ці варта называць яго «заснавальнікам сучаснага беларускага тэатра», як гэта робіць Няфёд у сваёй кнізе (на 105 стар.).

Агульнавядома, што сучасны беларускі дзяржаўны прафесіянальны тэатр быў заснаваны Савецкай уладай у выніку перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і ўтварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Заснаваны ён быў на прынцыпова іншай аснове, чым беларускі народны тэатр, які існаваў да таго. Гэтай асновай з'явілася перш за ўсё поўная прафесіяналізацыя тэатра. Увесь калектыў браўся на дзяржаўнае ўтрыманне, чаго не было ні ў трупе Буйніцкага, ні нават у Першым таварыстве беларускай драмы і камедыі, якое стварылася пасля лютаўскай рэвалюцыі ў маі 1917 г. у Мінску. Абодва гэтыя калектывы былі яшчэ паўпрафесіянальнымі, бо, за малым выключэннем, іх удзельнікі займаліся тэатрам толькі ў вольны ад сваёй асноўнай работы час.

Па-другое, зусім новыя ідэйна-творчыя задачы паўсталі перад беларускім савецкім тэатрам. Тэатр станавіўся мастацкім агітпропам партыі ў справе выхавання шырокіх мас у духу камунізма. З месца забавы тэатр станавіўся школай эстэтычнага выхавання народа; адсюль, вядома, зусім мяняўся і метад працы, і творчы напрамак тэатра, яго рэпертуар. Апроч таго, беларускі дзяржаўны тэатр павінен быў сямімільнымі крокамі дагнаць рускія і іншыя тэатры Савецкага Саюза, каб стаць з імі ў адну шарэнгу.

Значыць, калі мы гаворым аб развіцці беларускага савецкага тэатра, мы павінны гаварыць перш за ўсё аб вялікай ролі рускага, які дапамог маладому беларускаму тэатру ў яго шпаркім прафесіянальным росце. Нацыянальнай жа асаблівасцю нашага тэатра з'яўляецца яго народнасць. Што да народнасці тэатра, то яе ў першую чаргу вызначае беларуская драматургія. Творы В. Дуніна-Марцінкевіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Кандрата Крапівы, Кузьмы Чорнага заклалі аснову народнасці тэатра. У аснове ж яго сцэнічнай культуры — музычна-спеўныя традыцыі народнага тэатра, якія знайшлі сваё высокае развіццё ў сучаснай беларускай оперы.

Сацыялістычны рэалізм, які з'явіўся асновай далейшага развіцця савецкага тэатра, адкрыў перад тэатрамі Савецкага Саюза шырокія перспектывы пошукаў нацыянальнай своеасаблівасці сцэнічных форм.

Калі мы з вышыні сённяшніх дасягненняў беларускага тэатра азірнёмся на пройдзены шлях, то, сапраўды, веліч нашых творчых здабыткаў выклікае захапленне.

Што ўяўляла сабой, скажам, Першае таварыства беларускай драмы і камедыі, найбольш буйная творчая арганізацыя, якая існавала напярэдадні стварэння беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра? Гэтае таварыства ў асноўным складалася з аматараў тэатральнай справы мінскіх аколіц Камароўкі і Старажоўкі. У ім быў досыць вялікі хор пад кіраўніцтвам Ул. Тэраўскага і танцавальная група, якой кіраваў Ч. Радзевіч. Акцёры працавалі «на марках», г. зн. на долях ад выручкі з касы. Спектаклі і канцэрты ставіліся ў асноўным два разы на тыдзень — у суботу і нядзелю. Пасля спектакля заўсёды адбываліся танцы ў зале пад духавы аркестр. Жыхары мінскіх аколіц ахвотна наведвалі «Беларускую хатку», бо яна давала магчымасць прагледзець досыць вялікую тэатральную праграму. У яе звычайна ўваходзілі адзін драматычны твор, невялічкая аднаактовая камедыя і ў заключэнне досыць разнастайны дывертысмент з выступленнем хору, дэкламацыяй і народнымі танцамі.

У рэпертуары часцей за ўсё былі п'есы Янкі Купалы «Раскіданае гняздо», «Паўл

Супярэчнасці адной кнігі

Зборнік апавяданняў П. Валкадаева «Егоркины рапорты» *) разлічаны на дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту. У зборніку два раздзелы: адзін з іх прысвечаны мінуламу нашай краіны (па форме гэта ўспаміны аб дзяцінстве), другі—людзям нашай сучаснасці.

Аднак паміж гэтымі раздзеламі розніца не толькі ў часе дзеяння, але намнога больш глыбокая і істотная: іх адрозніваюць своеасаблівы стыль і лексіка...

Першы раздзел складаецца з апавяданняў «Чапаны», «Волчий хутор» і «Встреча в степи», праз якія праходзіць адзін герой, падлетак, ад імя якога падаюцца падзеі.

Трэба адзначыць, што, пачаўшы чытаць першы раздзел зборніка, увесь час даводзіцца заглядваць у слоўнік, але і там не заўсёды можна знайсці тлумачэнне незразумелых слоў. Дыялектызмы, складаныя і мудрагелістыя звароты мовы, наўмысна каравыя сугуччы — усё гэта, як туман, распаўзаючыся па зборніку, засланяе ад чытача шырокія карціны жыцця, якія малюе аўтар. Як, калі не як стылізацыю «пад народ» успрыймаць такія моўныя ўпрыгожанні: «прицыкнула», «шибко», «шваркнуть», «озадки», «турлук», «взлобок», «кочедык», «дудак», «купыри» і мноства падобных. Чаму назойліва лезуць у вочы такія словы, як «поковыряное лицо мельничихи Хавроньи», «рыжий Филя», «Баянчиха», «каркающий голос»? Словы, здаецца, самі выстаўляюць напаказ свае каравыя формы. Бо ў такім, награмаджэнні абласных выразаў, спецыфічных гучанняў адступае на другі план або нават зусім губляецца карціна, жывы вобраз, думка.

Валкадаеў безумоўна шукае і арыгінальнай формы, і моўнай своеасаблівасці. Іншы раз гэта яму ўдаецца. Аднак пры адсутнасці пачуцця меры гэтыя пошукі прыводзяць да блытаніны, недакладнасці мовы. Напрыклад: «посинелые закрайки неба», «в распахнутые сенцы лезло закатное солнце», «посредине хутора растопырилась колченогая каланча», «на карнизе вымережены вензеля», «окна замурованы морозной известью», «слышу нелюдимый кашляющий смех» і г. д. Усё гэта незразумела, асабліва чытачам-школьнікам.

У апавяданнях зборніка адчуваецца мясцовы каларыт і дыханне часу, побыт і характар народа. Аднак, як мы бачым, аўтар часам парушае меру ў падборы моўных сродкаў. Вядома, што нават добрае ад празмернай колькасці можа стаць дрэнным, лішні мазок можа сапсаваць выдатную карціну. Яшчэ Горкі гаварыў: «няма нічога такога, што нельга было б укласці ў простыя ясныя словы». Вось аўтар для бачнасці вобраза выкарыстоўвае параўнанне: «Высокий, как колодезная подсоха, старик». Дойдзе да гэтага месца юны чытач, і задумаецца, што гэта за «подсоха».

У апавяданні «Чапаны» Валкадаеў мельнічыхе Хаўронні, адмоўнаму персанажу, дае характарыстыкі: слоўную (праз знешнасць: «поковыряное оспой лицо», «каркающий голос») і праз дзеянне (яна спакойна і па-ханжаску пакідае паміраць з голаду сваіх блізкіх родзічаў). Перадаваць характар праз заганы знешнасці — не метад, гэта ўжо даўно было вядома (напрыклад, за агідная знешнасцю Квазімоды і Гуінплена хавалася глыбока чалавечая душа). Таму дзейснай з'явілася толькі другая характарыстыка, а першая проста выклікае непрыемнае пачуццё, як знявага. Апісанне сну ў гэтым жа апавяданні вельмі сумбурнае і незразумелае. Нейкі сэнс можна ўлавіць толькі пры паўторным чытанні.

Аднак апавяданні першай часткі цікавыя перш за ўсё праўдай паказаных у іх падзей і псіхалагічным партрэтам хлопчыка Пецькі, героя гэтых апавяданняў, які жыве ў цяжкі час станаўлення Савецкай улады на Паволжжы. Шырока адкрытымі вачыма глядзіць ён, як у жорсткай барацьбе з новым адыходзіць з вёскі стары свет: злосна ашчэрыліся кулацкія банды («Чапаны»), за высокімі платамі прытаіліся багатыя і жорсткія людзі, якія жывуць па закону «чалавек чалавеку воўк» («Воўчы хутар»). Пецька адчуваў увесь цяжар першых год рэвалюцыі, але не сагнуўся маленькі хлопчык, сын бедняка, камбедчыка і байца чапаеўскай дывізіі. Ні ваўкі, з якімі ён сустрэўся ў стэпе, ні людзі-ваўкі, якія цкавалі яго сабакамі, не зламалі яго чалавечай гордасці і веры ў людзей.

Многа пісалі аб гэтых днях, але Пётр Валкадаеў здолеў знайсці свежыя фарбы.

Другая частка зборніка «Егоркины рапорты» («Караси», «Двое на льдине», «Егоркины рапорты») значна адрозніваецца ад першай і больш выразным стылем, і часам дзеяння, але вызначаецца некаторым шматслоўем. У гэтых адносінах характэрна апавяданне «Караси». У ім характары дзеючых асоб, хлопчыкаў-пяцікласнікаў Сярожкі і Лёнькі намаляваны псіхалагічна верна і жыццёва. Іх манеры, вобраз думак, учынкі — зусім натуральныя і адпавядаюць іх узросту. Ясна ўспрымаецца ідэя — барацьба школьнікаў за захаванне агульнанароднай уласнасці. Хлопчыкі высачылі і памаглі злавіць злодзея, які вылаўліваў у калгаснай сажалцы рыбу. Але апавяданне вельмі расцягнута.

Самае ўражлівае і глыбока чалавечнае — апавяданне «Двое на льдине». Не пачуццё болю і разгубленасць перад злой воляй лёсу выклікае ў нас смерць рыбака Міцяя, а здзіўленне перад спакойным подзвігам чалавека, перад яго характарам і сілай. Паступова раскрываюцца перад намі характары Міцяя і хлопчыка Прошкі. Аўтар паказвае іх не абстрактна, шляхам разважання, а ў дзеянні, у барацьбе. У збліжэнні з жыццём, у акалічнасцях працы і барацьбы выкрышталізоўваюцца рысы сапраўднага чалавека. Сюжэт сам па сабе даволі просты і не новы. Рыбак і хлопчык па волі выпадку аказаліся ў адкрытым моры на ільдзіне без рэальнай магчымасці выратавацца. Калі ўжо няма іншага выхаду, рыбак топіцца, даючы магчымасць хлопчыку пражыць яшчэ некалькі гадзін у спадзяванні на дапамогу. І справа, вядома, не ў сюжэце, а ў тым, наколькі аўтар здолеў яго выкарыстаць, каб паказаць хараство чалавека. Апавяданне вядзецца ў спакойных тонах, без надрыву і штучных страхаў. Міцяй перад пагрозай смерці захоўвае вытрымку, нават жартуе, каб заспакоіць свайго маленькага сябра: ён просіць перадаць жонцы, што Каспій узяў яго да сябе на службу, фермай з цюленямі загадваць.

«Двое на льдине» — вялікае апавяданне, і сюжэт у ім развіваецца павольна, без асаблівых перыпетый. Але гэта ўжо не расцягнутасць тэксту; такі марудны рытм патрэбен для стварэння ў чытача пэўнага настрою. Характэрна, што ад пачатку і да канца твор чытаецца з неаслабнай цікавасцю.

Апавяданне «Егоркины рапорты», якое завяршае зборнік, у сэнсе сучаснай літаратурнай мовы, на наш погляд, лепшае за астатнія: яно ачышчана ад дыялектызмаў. Але ў іх ёсць і загана: яго галоўныя героі, хлопчыкі Пашка і Ягорка, якія цяжка перавыхоўваюцца, становяцца самымі прыкладнымі ў паводзінах пасля першай жа размовы з інжынерам будаўніцтва.

Зборнік «Егоркины рапорты» —у асноўным цікавая і карысная кніга. П. Валкадаеў нядрэнна перадае дзіцячую псіхалогію, умее прасачыць адносіны дзяцей да акружаючага іх свету, за выключэннем спрошчаных характараў Пашкі і Ягоркі. Апавяданні насычаны мясцовым каларытам, добра адчуваецца час дзеяння. Аднак аўтар праэмерна захапляецца дыялектнай лексікай, што абцяжарвае ўспрыняцце яго твораў. А Валкадаеў, безумоўна, умее ствараць вобразы ў шырокім сэнсе слова — вобразы людзей і вобразную мову. Нават неадухоўленыя рэчы ў яго апавяданнях часта валодаюць сваім характарам. «Серое взъерошенное утро», «измятое белобрысое солнце», «спит ветерок, заблудившийся в камышовых джунглях» — такія свежыя вобразы часта сустракаюцца ў зборніку.

Такія супярэчнасці ў кнізе «Егоркины рапорты». Недахопы, аб якіх мы гаварылі, могуць прымусіць юнага чытача перагартаць карысную кнігу праз старонку, скарачаючы і спрашчаючы тое, што расцягнуў і ўскладніў аўтар. Нашы цікаўныя школьнікі вельмі патрабавальныя і да дарослых, якія ім даюць парады, і да кніг, якія пра іх пішуць.

Фр. МОДЭЛЬ,
настаўнік.

*) П. Валкадаеў. Егоркины рапорты. Дзяржвыдавецтва БССР, 1958.

З наступленнем цёплых веснавых дзён ажывіўся кніжны гандаль на вуліцах Мінска.

На здымку: продаж кніг на праспекце імя Сталіна.

Фота М. Мінковіча.

Для нафтабудаўнікоў

У Полацку пабываў калектыў артыстаў Тэатра оперы і балету. На гарадской сцэне быў пастаўлены балет «Лебядзінае возера».

Салісты тэатра далі вялікі шэфскі канцэрт для рабочых і служачых «Нафтабуда».

Цёпла сустрэлі будаўнікі выступленне народнага артыста рэспублікі І. Балоціна. Ен выконваў беларускія і рускія народныя песні, арыі з опер. У канцэрце ўдзельнічалі салісты оперы — лаўрэат VI Сусветнага фестывалю моладзі ў Маскве С. Гулевіч, З. Салаўёва, Л. Якімаў, Л. Ганестава і інш.

Вакальныя нумары чаргаваліся з танцамі. Артыст Г. Мартынаў і салістка балету Н. Дароніна выканалі рускі танец «Сустрэча», Л. Ражанава і В. Міронаў — вальс Шапэна. Былі паказаны тырольскі танец, кракавяк, цыганскі танец. У іх удзельнічалі артысты М. Шэхаў, А. Карзянкова, Б. Карпілава, Г. Папоў і інш.

Нафтабудаўцы горача дзякавалі гасцям за цікавы канцэрт.

Н. АНТОНАВА.

З МІНУЛАГА

Рэпін у Беларусі

Калі Ілья Яфімавіч Рэпін прыехаў у Каралёва, пажар яшчэ быў у самым разгары. Агонь перакідваўся з аднаго даху на другі. У сэрцы Рэпіна ў гэтыя трывожныя начныя гадзіны змагаліся два пачуцці. Як мастак ён не мог адарваць вачэй ад незвычайнай карціны начнога полымя, якое здавалася нейкай фантастычнай дэкарацыяй на фоне цёмнага начнога неба. Адначасова сэрца яго пранізваў востры боль. Колькі гора нясе гэтае жахлівае здарэнне пагарэльцам, якія засталіся без прытулку!

Рэпін сам выйшаў з працоўнай, беднай сям'і і гора селяніна ўспрымаў, як сваё асабістае. Таму і не мог ён уселзець дома, калі даведаўся, што гарыць суседняя вёска Каралёва.

Ілья Яфімавіч хутка прыехаў туды на брычцы і разам са сваім кучарам памагаў перадаваць ваду ад калодзежа да палаючых будынкаў. Прыезд Рэпіна падбадзёрыў сялян:

— Ілья Яфімавіч тут, — пачулася па радах, і нават тыя, што дагэтуль стаялі ў баку, цяпер прынялі ўдзел у барацьбе з агнём.

Потым Рэпін і матэрыяльна дапамог пагарэльцам, але ім даражэй за грошы былі сапраўды чалавечае спачуванне і сардэчныя клопаты, якія ён выказаў да працоўных у часіну іх гора.

Мастак даўно задумаў набыць сабе на лета куток, каб у спякотныя месяцы не заставацца ў душным Пецярбургу.

Ен адчуваў і потым неаднаразова адзначаў у сваіх пісьмах, як тающь яго сілы. І думка ўрачоў была аднадушнай — на паветра, бліжэй да прыроды, дзе можна спалучаць працу з адпачынкам.

Поспех карціны «Запарожцы», якую мастак прадаў, дапамог Ільі Яфімавічу выканаць прадпісанне ўрачоў. Ен доўга шукаў дачу, быў патрабавальны да выбару і, нарэшце, спыніўся на Здраўневе.

Ен хацеў, каб дача была ля ракі, а міма Здраўнева працякала Заходняя Дзвіна. Ен любіў лес — каля Здраўнева распасціраліся лясы. І яшчэ ён хацеў, каб паблізу былі вёскі, дзе ён сярод простага народа мог бы завесці шырокае кола знаёмых, сяброў. І гэтаму адпавядала Здраўнева. Паблізу былі вёскі Слабада, Каралёва. Рэпін хутка аформіў купчую.

На другі дзень пасля прыезду ў Здраўнева Ілья Яфімавіч ужо крочыў сцежкамі да сваіх суседзяў. Ваколіцы Здраўнева ў Беларусі напаміналі Рэпіну Чугуеў на Украіне.

Сярод жыхароў суседніх вёсак асабліва спадабаўся яму адзін малады селянін з разумным выразным тварам, прыгожай капой валасоў і жывымі пранікліывымі вачыма. Ен быў невысокага росту, але добра, моцна складзены і апранаўся заўсёды добра і акуратна. Сустрэча адбылася ў першы год пасля прыезду ў Здраўнева, але Рэпін доўга прыглядаўся да Сідара Шаўрова, і толькі на трэцяе лета прабывання ў Здраўнева вырашыў намаляваць яго.

Сідар Шаўроў ахвотна пазіраваў пецярбургскаму мастаку. Паміж Рэпіным і яго маладым сябрам завязваліся самыя розныя размовы:

— Ты чытаў «Чыгунку» Некрасава?

— Не.

— Пачытай. Гляджу я на цябе, ты зусім не падобны на тых беларусаў, аб якіх пісаў Мікалай Аляксеевіч.

— Ен пра што ж пісаў? — цікавіўся хлапец.

— Пісаў пра худых, бледных, знясіленых людзей, якія з апошніх сіл будавалі «жалезку»...

— Што ж, праўду пісаў, — пагаджаўся Шаўроў. — Многа сярод нас ёсць такіх, што больш на мерцвякоў падобныя, чым на жывых. І ўсё гэта ад нястачы...

З кісцю ў руках Рэпін аб усім забываў, але гэтыя словы Шаўрова яго глыбока ўсхвалявалі. Просты народ! Колькі пакут і выпрабаванняў на яго шляху. Шаўроў запрашаў да сябе Рэпіна, і мастак ахвотна хадзіў у госці да маладога сябра ў вёску Сахарава.

Дочкі Рэпіна — Вера і Надзя пыталіся ў бацькі, чаму ён выбраў для карціны маладога беларуса, а не старога. Ілья Яфімавіч адказваў:

— Я хацеў у гэтым партрэце ўвасобіць народ, які абуджаецца, яго маладосць, яго будучыню, яго сілу.

У 1892 г. партрэт Сідара Шаўрова з вёскі Сахарава быў закончаны. Рэпін назваў карціну адным словам «Беларус», але выказаць ёю ён хацеў многае, і перш за ўсё свае адносіны і павагу да народа, сярод якога жыў ужо трэці год.

Глыбокі знаўца гісторыі, Ілья Яфімавіч з захапленнем чытаў усё, што датычылася гісторыі Беларусі. Захавалася цікавая перапіска Рэпіна з мясцовым краязнаўцам Сапуновым. Сапуноў рэгулярна дасылаў мастаку зборнікі па гісторыі Віцебскай губерні. Кнігі гэтыя грунтоўна расказвалі пра мінулае заходняй Расіі, яны сур'ёзна зацікавілі Рэпіна, які неаднаразова ў сваёй творчай рабоце звяртаўся да тэм з мінулага.

Ілья Яфімавіч пісаў Сапунову: «Дзякую за прысланыя мне кнігі аб «Віцебскай старажытнасці». Прачытаў з цікавасцю». Далей Рэпін у гэтым жа пісьме, датаваным і снежня 1897 г., адзначае сур'ёзнасць навуковай работы, якую прарабілі беларускія гісторыкі.

Вечарамі адзін або часцей у суправаджэнні дачок Рэпін любіў прайсціся ў бліжэйшыя вёскі. Спадала летняя спёка, паветра станавілася прахалодным. Кругом было ціха, і толькі адкуль здалёку то гучна, то зусім прападаючы, даносіліся звонкія дзявочыя галасы. Рэпін любіў народныя песні. У Чугуеве з дзяцінства ён прывык да меладычных і кранальных украінскіх песень. Ен і сам ведаў іх нямала. Цяпер ён з хваляваннем слухаў сакавітыя беларускія песні і знаходзіў у іх многа агульнага з мелодыямі мілай Украіны.

Рэпін з дочкамі падыходзіў да прызбы, дзе сядзелі дзяўчаты, Вера і Надзя ўжо ведалі некалькі песень і ахвотна падцягвалі дзяўчатам. Рэпін слухаў маўкліва.

А раніцай зноў пачынаўся неспакойны працоўны дзень. Для Ільі Яфімавіча сапраўдным святам былі пісьмы ад Стасава. Рэпін стараўся не затрымліваць адказы і пісаў яму: «А я тут у Здраўнева (так называецца маёнтак, які належыць мне) жыву самым сапраўдным першабытным жыццём, якім жылі яшчэ грэкі Адысея. Працую, капаю зямлю рыдлёўкай, ды камене нашу, часта ўспамінаючы Сізіфа, і зайздрошчу цудам Антэя».

Рэпін не толькі гаспадарыў, але і многа маляваў. Царкву ў суседняй Слабадзе ён распісаў у рэалістычным, рэпінскім стылі. Ілья Яфімавіч любіў маляваць дачок, якія з дзіцячых год прывыклі быць для бацькі цярплівымі і паслухмянымі натуршчыцамі. І цяпер дочкі ахвотна пазіравалі для Ільі Яфімавіча. Ен пісаў іх на ўлонні прыроды. Яго самога гэтыя гадзіны, праведзеныя на свежым паветры, хоць і за работай, як бы вылечвалі. У Здраўнева ён намаляваў партрэты Надзі ў паляўнічым касцюме і Веры з асеннім букетам.

Гаспадаром Рэпін быў своеасаблівым, усе яго думкі былі накіраваны на тое, каб дапамагчы суседнім сялянам-беднякам аблегчыць іх жыццё. І сяляне ведалі, што яны заўсёды знойдуць у Здраўнева дапамогу і падтрымку. Тут ім танней, чым у іншых месцах, прадавалі збожжа на пасеў, а іншы раз у беднякоў і зусім нічога не бралі. Тут пры неабходнасці можна было папрасіць каня для палявой работы. Рэпін сам сачыў, каб беднякам не адмаўлялі ў іх просьбах. Для Рэпіна гэта была не проста дабрачыннасць. Ен добра ведаў, што такое нястача, і дня не мог бы пражыць у Здраўнева, калі б не адчуваў, што іменна тут, жывучы сярод народа, можа быць карысным беднаце. У артыкуле пра свайго любімага мастака Н. Ге Ілья Яфімавіч з вялікай душэўнай цеплынёй закрануў гэтую тэму.

Рэпін успамінае выказванні Н. Ге пра мужыка: «З мужыком трэба доўга, вельмі доўга гаварыць і тлумачыць яму — ён зразумее ўсё. Я люблю з ім разважаць, мяне гэта вельмі займае. І людзі ж цудоўныя».

Рэпін прагна шукаў новых сустрэч. Гэта, як успамінаюць сучаснікі, была яго прафесіянальная рыса. Новыя сустрэчы абяцалі яму новыя задумы, падказвалі новыя тэмы. Шукаў ён гэтых сустрэч і жывучы ў Здраўневе. Ен часта выязджаў у Віцебск па працэ або на вазку.

Рэпін хадзіў па гораду, з Успенскай горкі любаваўся агульным краявідам Віцебска, аглядваў старажытныя будынкі і па-таварыску дакараў мясцовых мастакоў, што яны недастаткова цікаўныя і няўважлівыя да тэм і сюжэтаў, якія падказвае ім сама навакольная рэчаіснасць.

У летнія месяцы 1892—1900 гг. Рэпін жыў у Беларусі і сардэчна палюбіў яе народ. Потым у Пенатах, сярод прыгожых паўночных лясоў, мастак часта ўспамінаў Здраўнева на Заходняй Дзвіне. Ды ён і не мог забыць Здраўнева, бо там быў пахаваны яго бацька. Прайшлі многія дзесяцігоддзі. Даўно няма ў жывых і самога Ілы Яфімавіча, але вялікага мастака не забылі ні ў адным кутку нашай неабсяжнай краіны і асабліва добра памятаюць яго там, дзе ён пражыў некалькі год. Будынак Рэпіна ў Здраўнева спалілі фашысты. Але сюды, да былога рэпінскага кутка, часта прыходзяць экскурсанты, любяць сюды прыязджаць на натуру, каб замаляваць цудоўныя мясціны, маладыя мастакі. Пра Рэпіна сабраны цікавыя матэрыялы ў Віцебскім краязнаўчым музеі. Пра многае апавядаюць гэтыя матэрыялы, і ў асаблівасці — пра любоў мастака да простага народа.

У знак удзячнасці беларускі народ на адным з будынкаў Мікалаеўскага сельсавета, дзе знаходзіўся маёнтак у Здраўнева, устанавіў бронзавую мемарыяльную дошку з наступным надпісам: «Вялікі рускі мастак Ілья Яфімавіч Рэпін жыў у вёсцы Здраўнева з 1892 па 1900 гг.».

Яфім САДОЎСКІ.

Дзеці—героі

Так называецца зборнік, выпушчаны Дзяржаўным вучэбна-педагагічным выдавецтвам Украіны ў серыі «Школьная бібліятэка». Можна смела сказаць, што гэты зборнік стане настольнай кнігай кожнага піянера і школьніка. У ім сабраны матэрыялы аб дзецях-героях усіх саюзных рэспублік, пачынаючы з векапомнага Кастрычніка да нашых дзён. Матэрыялы напісаны лёгка, цікава, у даступнай для дзіцячага разумення форме.

У прадмове двойчы Герой Савецкага Саюза С. Каўпак піша, што на ўсіх этапах стварэння і развіцця Савецкай дзяржавы—у гады цяжкіх выпрабаванняў і ў гады мірнай стваральнай працы—нашы дзеці з'яўляліся і з'яўляюцца вернымі памочнікамі сваіх бацькоў, братоў і сёстраў у будаўніцтве новага жыцця.

З захапленнем прачытаюць юныя чытачы і пра незабыўнага героя Пашу Андрэева, які мужна змагаўся і загінуў у дні рэвалюцыйных баёў 1917 г. у Маскве, і пра легендарнага ўральскага піянера Паўліка Марозава, пра адзінаццацігадовую гераіню першых пяцігодак таджыкскую піянерку Мамлакат Нахангаву, пра піянераў Герояў Савецкага Саюза Лёню Голікава і Валю Коціка, і пра бакінскага школьніка Тофіка Гусейнава, і пра многіх іншых смелых і мужных піянераў.

Ёсць матэрыялы і аб дзецях-героях Савецкай Беларусі. У нарысе Г. Шыловіча «Запіска на шыбе» расказваецца аб вучаніцах трацяга класа Лідзе Самайлюк і Любе Таруцінай, якія дапамаглі пагранічнікам затрымаць парушальніка дзяржаўнай граніцы СССР. «Піянер Жора Сасноўскі»—так называецца нарыс А. Геруса пра гомельскага піянера, які загінуў ад кулацкай рукі ў гады калектывізацыі. Аднаму з наймалодшых абаронцаў Брэсцкай крэпасці Валодзю Казьміну прысвечаны нарыс «Гарніст сорак чацвёртага палка» Я. Курто і П. Ткачова. Аб слаўным беларускім піянеру Мараце Казею расказаў В. Марозаў у нарысе «Чатырнаццатая вясна». Апрача гэтага, у зборніку змешчаны матэрыялы пра юных абаронцаў Брэсцкай крэпасці Пецю Клыпа і Валю Зенкіну, пра юных барысаўскіх падпольшчыкаў Віктара Пашкевіча, Меліка Буцвілоўскага і Сашу Клімковіча, пра обальскіх мсціўцаў сясцёр Зіну і Галю Партновых і інш.

Ці не варта і нашаму Вучэбна-педагагічнаму выдавецтву падумаць аб выданні падобнай кнігі? Нам здаецца, што варта. Наша слаўная дзетвара заслугоўвае гэтага.

У гэтую кнігу патрэбна будзе ўключыць не толькі матэрыялы пра дзяцей-герояў Вялікай Айчыннай вайны, але і пра дзяцей, якія прымалі актыўны ўдзел у барацьбе беларускага народа за ўстанаўленне Савецкай улады ў Беларусі, у грамадзянскай вайне, аднаўленні народнай гаспадаркі рэспублікі, калектывізацыі, а зараз уносяць пасільны ўклад у будаўніцтва камуністычнага грамадства.

Аб юных удзельніках Айчыннай вайны і пасляваеннага мірнага будаўніцтва ў нас ёсць багата матэрыялаў. Значна менш іх пра ўдзел дзяцей у рэвалюцыйных падзеях, грамадзянскай вайне і пра першыя гады Савецкай улады. Але што такія матэрыялы знойдуцца—не можа быць ніякага сумнення; варта толькі пашукаць. У зборы іх вялікую дапамогу могуць аказаць старыя бальшавікі, былыя чырвонагвардзейцы, байцы Чырвонай Арміі, партыйныя і савецкія работнікі, супрацоўнікі навуковых устаноў, архіваў, бібліятэк і г. д. У кнігу неабходна будзе змясціць не толькі разгорнутыя матэрыялы, але і кароткія заметкі, якія друкаваліся ў газетах таго часу, часопісах, зборніках.

П. РУНЕЦ.

Артысты Беларускай дзяржаўнай філармоніі абслугоўваюць канцэртамі калгаснікаў Мінскай вобласці. У канцэртнай брыгадзе ўдзельнічае канцэртны ансамбль Беларускага дзяржаўнага народнага аркестра і салісты філармоніі.

На здымку: канцэрт у калгасе «Чырвоная зорка» Старобінскага раёна. Выступаюць выканаўца жартоўных і лірычных песень Ірына Палянская і баяніст Раман Ган.

Фота М. Рубінштэйна.

Бібліяграфічныя памяткі

Некалькі год назад аддзел беларускай літаратуры і бібліяграфіі Дзяржаўнай бібліятэкі імя Ул. І. Леніна правяў добрую ініцыятыву. Супрацоўнікі аддзела пачалі выдаваць бібліяграфічныя памяткі «Пісьменнікі БССР». За гэты час былі выдадзены памяткі аб жыцці і літаратурнай дзейнасці Я. Купалы, Я. Коласа, М. Лынькова, І. Шамякіна, Я. Брыля і іншых беларускіх пісьменнікаў.

Нядаўна выйшлі з друку памяткі пра Паўлюка Труса і Пімена Панчанку, якія склала Н. Ватацы.

У памятцы аб Паўлюку Трусу змешчаны біяграфічная і бібліяграфічная даведкі, у якіх даволі падрабязна расказваецца аб асноўных творах паэта, пераказваецца іх змест. Вельмі карысны раздзел «Літаратура аб жыцці і літаратурнай дзейнасці П. Труса». Тут прыводзяцца назвы артыкулаў П. Глебкі, М. Лужаніна, А. Якімовіча, К. Чорнага, А. Александровіча і інш.

Не менш цікавая даведка аб Пімену Панчанку. Яна знаёміць чытача з выданнямі твораў і крытычнай літаратурай, прысвечанай разгляду паэзіі пісьменніка. Аб папулярнасці вершаў П. Панчанкі сведчыць той факт, што за апошнія 20 год выдадзена 18 яго кніг тыражом 152 тысячы экземпляраў.

Асобны раздзел знаёміць з кнігамі паэта, выдадзенымі на рускай мове ў выдавецтвах «Советский писатель» і «Молодая гвардия». Вершы П. Панчанкі перакладаліся М. Ісакоўскім, М. Асеевым, М. Святловым, М. Браунам, А. Пракоф'евым і іншымі паэтамі.

У раздзеле «Крытычная літаратура аб творчасці Пімена Панчанкі» сабраны назвы артыкулаў і рэцэнзій, якія былі змешчаны ў перыядычным друку за апошнія гады. У бібліяграфічную памятку ўключаны таксама алфавітны ўказальнік твораў П. Панчанкі.

Бура ўзнялася з начы

АПАВЯДАННЕ

Іван ПТАШНІКАЎ

Май на прадлецці шумеў навальніцамі. Яны пачыналіся надвячоркам ужо другі тыдзень.

Хмары толькі і вартуюць сонца, каб не даць яму паволі астыць у вячэрняй далёкай смузе; адразу ж, як толькі яно схінецца на захад,— адтуль, з лагоў, устаюць яны, бурыя, сунуцца цяжкімі тулягамі.

Млее тады ваколле ў парнай знямозе. Сонца не відно, яно ўжо там, за густой барвовай смугой, нібы расплавілася, — і з-за таго такая духата.

А хмары, бурыя і пагрозлівыя, мкнуць на вёску асвяжыць яе ад заранняй гарачыні.

Усе гэтыя вечары Аркадзь чакаў нечага немінучага. Яно ніяк не магло акрэсліцца ў думках і знікала ў клопатах.

Бульбу вось нядаўна ў зямлю ўкінулі, а платы ад рэчкі скаціна яшчэ з восені паламала. Жэрдзе хоць паміж старых калкоў варта пазацягваць. Рукі ж у маці нядужыя, і ў яго не зусім стае сілы, каб па-мужчынску калок убіць.

Ен вітаваў старыя яловыя калкі, закладаючы пашчапаныя, крывыя бярозавыя жэрдкі.

Не глядзеў на неба. Вецер падзьмуў неяк каля самай ужо зямлі, густы і вільготны, нібы з дзвярэй распаранай лазні. Ен свяжыў намоклую ад поту кашулю і яна хлыстала па плячах; ён шуршэў і нерваваўся ў маладой ліпкай лістоце бярозавых галінак, бы хацеў ацерабіць іх і падхапіць голыя дубцы ў чыстае поле.

Першы гром быў далёкі. Сухі, як трэск. Ен змусіў паглядзець на небакрай, у той бок на вярбу-рагач ля анэліных хлявоў, над якімі навісла клубком бурая хмара. Аднекуль павеяла гарру.

Ен кінуў жэрдзе, надняў тапор, цяжкі, з крывым, у смале тапарышчам, і закрочыў баразной да хаты.

Ноч выдасця ў грымотах. Да зары яны ці перацяхнуць. Абклала наўкруг. Пазаўчора ссекла ліпу ля фермы, пакрышыла камель на друзалкі. А гэту старасвецкую дрыўляную гніль пад хатай і не зачэпіць ніколі. Хіба самога бога прасіць, каб нанёс пяруна? — і ён усміхнуўся.

Ен кінуў мітуслася ў чырвонай нажутцы маці. Яна збірала з плоту бялізну, якую вецер трапаў, ледзь не разрываючы, і, ухапіўшы якую, крушіў па двары ў жвірку і тасочніку.

Ноччу будзе навальніца. Слядоў на дварэ не застанецца. Вецер стане ганяць варотцы. Іх трэба будзе адшчапіць наперад. Скрыпу дзвярэй маці не ўчуе. Толькі вось клямка цяжкавата падымаецца, бразгоча. Трэба было даўно ў кузні зрабіць новую. Маці неяк сароміла яго.

Пад бэлькай — брусок толу. Ен намацаў яго пазаўчора, шукаючы абцуті. Брусок дзе-ні-дзе аж пачарнеў. Ведама, ляжыць яшчэ з тых дзён, калі маці знайшла яго ў саломе, дзе начавалі партызаны. Колькі раз, угледзеўшы яго, хлопцы выпрошвалі на рыбу. Але ён сам думаў выклянчыць які метр бікфордавага шнура ў карчаўнікоў і падняць у віры з дна лінёў.

Ёсць ужо шнур і капсуль. Ен аж два дні зносіў у шліхты карчы за гэта.

Тол. Тут толькі тол. Адпілаваць кавалак грамаў сто. Хаця, каб не замнога аказалася. Тады...

Вось-вось навальніца. Ад таго дрыўлянага трухля застанецца толькі мокры пыл і асколінкі.

І па крыжах жа б'е пярун...

А калі не ў гэту ноч, дык у адкрытую тады возьмем...

Гарачка не мінала. Ныла душа. Рана была нанесена зусім знячэўку: у яе аднялі агарод.

— А жыць з чаго? Га?! Не маеце права адымаць у старой. Гэта ж падумаць... — чаплялася яна за апошнюю ўратавальную галінку, за старасць.

Сход закалыхаўся. Здавалася, людзі рассунуць сцены канцылярыі.

— На тваю гэткую старасць можам пакінуць гародчык каля рэчкі — і хопіць... — Маці Аркадзя, якая вяла сход, ужо злавала і чарнілкай так ударыла па доўгім рыле графіна, што шкло пасыпалася на падлогу. Па абрусе пацякла вада.— А раз ты выкручваешся ад калгаснай работы — шукай хлеба на сваю старасць пад рагозінскімі капліцамі. Ці даўно гэта па вечарынках кінула гайсаць? Старой стала... Нам жа з табой толькі за сорак летась пераваліла. Нябось, шпікуліраваць, дык ногі носяць, як падсмаленую...

— Вось гэта яна ёй падкалола... Патачкі не дае Андрэіха... — закруціў галавою стары Мацей, Анэлін сусед, які апёрся на падваконне ля самага стала.

— На мыла! На мыла тады адпраўце мяне... Гэта ж падумаць... — Зямлі шкада. А ты, Андрэіха, лепш заткніся пра капліцы. Пад твой крыж прыду ды расцягнуся.

Яе словы выдаліся нейкімі рэзкімі мо' таму, што павіслі ў цішыні. Чуваць стала нават, як капка ўпала са стала на падлогу. І тут, відаць, лопнула цярпенне ў старога Мацея. Ен страпянуўся. Хата ўгледзела яго і чакала.

— Цьфу!.. Паскудніца... Яна, падумайце вы, што крычыць... — перадражніў ён пад смех. Колькі год ты калгасныя соткі задарма абдойвала? Ты, лічы, адразу пасля вайны не ў калгасе апынулася. Я цябе разы са два толькі бачыў у баразне. Тырчала сяды-тады для прыліку. До!.. Ведаю пра ўсё і маўчаць не буду. Вёска таксама цябе ведае... Не забыліся, каму ты ў вайну паціфон накручвала, калі карнікі вёску пяклі. А Андрэіхі не руш. Не твайго носа палоса. Яе муж на фронце злёг. І сама яна не проста жанчына — праўленец наш.

— Праўду Мацей адчасаў, праўду... — у хаце адабральна загулі.— Не даруем — і баста. Адрэжам па вуглы. Хай паскача. Не калгасніца яна наша.

— Адрэзаць! Адрэзаць!..

— Адсекчы! — паправіў Мацей, спусціўшы руку на рог стала.

Папрасіў слова старшыня — зноў стала ціха. Раптам нехта локцем высадзіў шыбіну, яна зазвінела. Ля акна на лаве засыкалі, кагосьці саромячы.

— Я згодзен, што трэба адрэзаць гарод, як кажа Мацей, адсекчы Толькі ж ранавата нашай Анэлі ў дом састарэлых... — хутка загаварыў старшыня.— Я думаю так: пакінуць ёй дзесяць сотак, а астатнія — пад калгасныя каноплі. А выйдзе на работу, возьмецца за розум, мо' тады і перагледзім што-кольвечы.

— Правільна! Толькі так!..

Анэля ўскочыла і затрэсла хусцінай, якую туга перацягла рукой, ледзь не над самым сталом:

— Знайшоўся начальнік такі... Скуль узяўся? Сваёй галавы хіба не маеш, што андрэішыным плёткам падтакваеш? Гэта ж падумаць...

Кожны хацеў гаварыць. Але Мацей зноў стаў распіхаць усіх, праціскаючыся да Анэлі. Тая нават адхіснулася на ўслончыку, бо не ведала, што стары мае за намер. Мацей жа склаў пальцы пісталетам і паднёс іх пад нос Анэлі.

— Самую сябе, — пачаў ён ціха, — ты можаш выстаўляць, як хочаш... А старшыні ніхто табе не дазволіць чарніць. Ты ўсіх нас абражаеш. Ен камуніст! Яму лепш відаць, што і да чаго. Сказаў адрэзаць дзялку — я першы прагаласую. Варта табе. Зарабіла...

Пасля гаварылі ўсе.

Анэля ішла дадому ўсхваляваная, злосная. Ня-

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Беларускія нацыяналісты і ператварылі яе ў камерцыйнае прадпрыемства, у расадник буржуазнай ідэалогіі. На чале «хаткі» стаў вядомы палітычны махляр і авантурыст Ф. Аляхновіч, які пачаў запаўняць рэпертуар сваімі «творамі» накшталт «На Антоколі», «Адам і Ева», «Манька» і інш.— танными меладрамамі і фарсамі, зробленымі па найгоршых узорах заходнееўрапейскай камерцыйнай драматургіі.

Наогул рэпертуар Першага беларускага таварыства драмы і камедыі ў тыя дні пераважна складаўся з камедый і фарсаў. Калі ставілася часам драма (часцей за ўсё ме

У ВІДЗАЎСКІМ РАЁНЕ

РАСЦЕ СЁТКА КУЛЬТАСВЕТУСТАНОЎ

З кожным годам расце і ўмацоўваецца эканоміка калгасаў раёна, расце і культура калгаснай вёскі. Аб гэтым сведчаць лічбы. Два гады назад на тэрыторыі раёна працавала пяць дамоў культуры, два сельскія клубы, дзесяць хат-чыталенъ і дваццаць бібліятэк. Агульная колькасць кніг у іх складала 59 тысяч экземпляраў.

У сучасны момант колькасць культасветустаноў павялічылася ў паўтара разы. Толькі летась у раёне адкрыта шэсць новых сельскіх дамоў культуры. Кніжны фонд вырас на 22 700 экземпляраў.

Вялікую ўвагу надаюць будаўніцтву клубаў калгасы. Члены дзевяці сельгасарцелей раёна будуюць клубы. Асабліва арганізавана вядзецца гэтая работа ў калгасах імя Мічурына, «Савецкая Радзіма», «40 год Кастрычніка» і інш.

«ПАЎЛІНКА» НА КАЛГАСНАЙ СЦЭНЕ

Добрай славай у калгасе «Маладая гвардыя» карыстаецца калектыў мастацкай самадзейнасці, якім кіруе дырэктар Казянскай сярэдняй школы Марыя Васільеўна Савічава. Самадзейныя артысты часта выступаюць перад калгаснікамі з цікавымі канцэртамі.

Нядаўна на калгаснай сцэне была паказана камедыя «Паўлінка» Я. Купалы.

АСАБІСТЫЯ БІБЛІЯТЭКІ

У раённым кніжным магазіне часта можна сустрэць настаўніка сярэдняй школы Сяргея Троцкага, медыцынскую сястру Раісу Савасцянаву, служачага Аляксандра Барбута. Яны з цікавасцю сочаць за навінкамі літаратуры і заўсёды набываюць кнігі беларускіх, украінскіх, рускіх пісьменнікаў. У кожнага з іх ёсць уласныя бібліятэкі, у якіх налічваецца па 250—300 тамоў розных кніг.

Асабістыя бібліятэкі ствараюць і хлебаробы калгаснай вёскі. Так, у члена сельгасарцелі «1-е мая» Уладзіміра Майсяёнка ў асабістай бібліятэцы — 213 кніг, у калгаснікаў сельгасарцелі імя Жданава Васіля Пудава і імя Вышынскага Барыса Анфімава і ў іншых таксама ёсць уласныя бібліятэкі.

АБМЕРКАВАННЕ РАМАНА

Відзаўшчына — край азёр. Яе землі мяжуюць з дзвюма братнімі рэспублікамі — Літвой і Латвіяй.

Вось чаму, калі ў раённым Доме культуры праводзілася канферэнцыя чытачоў па раману П. Броўкі «Калі зліваюцца рэкі», сюды прыехалі прадстаўнікі Ігналінскага раёна Літоўскай ССР.

Канферэнцыю адкрыла бібліятэкар Галіна Мікішкіна, якая расказала аб жыцці і літаратурнай дзейнасці аўтара рамана. Сваімі думкамі аб кнізе і яе героях падзяліліся Артур Карэнька, Аляксей Дземідзенка, Таццяна Коркава і інш.

П. КАБАК.

—●—

Навуковая канферэнцыя

У Мінскім педагагічным інстытуце імя Горкага адбылася навуковая канферэнцыя, прысвечаная абмеркаванню студэнцкіх навуковых работ.

Цікава прайшла работа секцыі беларускай мовы, якой кіраваў кандыдат філалагічных навук Ф. Янкоўскі.

Выкладчыкі і студэнты праслухалі даклад студэнта IV курса Н. Гуліцкага «Трапнае слова ў «Вожыку».

Мове мастацкіх твораў прысвяцілі свае даклады студэнткі Л. Хаменка («Аб мове апавядання Я. Коласа «Васіль Чурыла»), Т. Дубоўская («З назіранняў над мовай апавядання Я. Коласа «Соцкі падвёў») і аб працы аўтара над моваю) і А. Піменава («Няўласна простая мова ў аповесці Я. Коласа «На прасторах жыцця»).

Аб лексічных асаблівасцях дыялектаў Столінскага раёна расказала ў дакладзе студэнтка Л. Сіневіч.

Выкладчыкі і студэнты з цікавасцю праслухалі даклад студэнткі Кіеўскага педагагічнага інстытута Бандарэнка «Памяншальна-ласкальныя суфіксы ў аповесці Марка Ваўчок «Інстытутка».

М. ВАСІЛЕЎСКІ.

На опернай сцэне

У Мінску з поспехам прайшлі выступленні салісткі Куйбышаўскага тэатра оперы і балету — заслужанай артысткі Таджыкскай ССР І. Савельевай. Яна прыняла ўдзел у спектаклях Тэатра оперы і балету «Лебядзінае возера» П. Чайкоўскага (партыі Адэты і Адыліі) і «Дон-Кіхот» Л. Мінкуса (партыя Кітры).

Мінчане цёпла сустрэлі госцю з Куйбышава.

Бура ўзнялася з начы

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

хай гудуць. Але яна абыйдзецца і без іх, без калгаса. І Андрэісе не дарае. Гэта ж падумаць...

Аркадзь адчуваў сябе самотна на ўлонні роснай раніцы, што дыхала бэзам з гародчыка, калі ён бачыў схаваны ў зеляніне старасвецкі абчэс дрэва.

Хто і калі змайстраваў гэты прывід у гародчыку, Аркадзь ведае.

Раней тут канчалася вёска. І людскі розум, каб захаваць чалавека ад бед, збудаваў тут драўляную капліцу. Тыя людзі і той час даўно сцерліся ў памяці вяскоўцаў. Але жыў ён — пашчапаны ад сонца і ўсыпаны каростай моху ад дажджоў і пылу — крыж. Стаяў пад самым акном.

Расла вёска з гадамі. І, нарэшце, прадзед Аркадзя, Лукаш, адгрукаў сабе будыніну непадалёк ад капліцы. Тады гэта, відаць, гарантавала старому збавенне. І калі яшчэ маці Аркадзя была малой і жыла не тут, на канцы вёскі, а там, дзе цяпер пад вербамі калгасная канцылярыя, яна бачыла, як рухнула была аднойчы капліца. Тады думалі, мор на вёску наплыве. Не збудавалі тады новай капліцы, але і не знішчылі яе дарэшты. Крыж, які тырчаў пасярод яе, драўляны, афарбаваны ў блакітны колер, як і яна ўся, укапалі на гэтым самым месцы.

...Гародчык буяў ад зелені. Яна шугала ўгору, вісла голлем над частаколам, лезла між штакецін на двор і на вуліцу.

Усё жывое заглушаў тут белы бэз, той куст, што ад вуліцы, за які ўчора маці лаяла дзяўчат, што вечарам павыкручвалі голле, рвучы кветкі. Няма горш, як садзіць кветкі ад вуліцы. Падняўся на лаўку — і даставай аж зверху. Але нічога, маці далася тым верхалазам у знакі, запомніць.

Да вайны каля хаты раслі чатыры таполі. Згарэла ад міны хата, пачарнелі таполі, не ачунялі. А крыж уратаваўся.

Не захацела маці бачыць перад акном падгарэлыя дрэвы. Скінулі іх на дровы. Перацягнулі на дрывотню. А крыжа не зачапілі. Хоць бы, здаецца, знянацку раструшчыла яго якая таполя.

У тое лета пасадзілі сюды яшчэ яблыню, чарэмшыну, два кусты язміну, белую ружу. Толькі вось аднаго не даўмеліся...

Там, дзе зліпліся крыж-на-крыж два кавалкі дрэва, — фігурка Ісуса Хрыста. Народжаны і распяты фантазіяй чалавека, ён гібее тут, звесіўшы галаву.

На распяцці безліч ручнікоў. Першы, спадыспаду, што прыкрывае да пояса прыпляснелае ад часу волава, — з суравога палатна. Хто ведае, якой ён даўнасці. Пад верх, калі вецер трэпле ашмоцце, выглядае нават крамніна. Гэта пазнейшыя ахвяраванні.

На крыжы знаходзяць утулак шпакі, вераб'і. Садзяцца, чысцяць дзюбкі. Летась былі спанатрылі ластаўкі, гняздо ляпіць пачалі. Над самай галавой Хрыста, пакрысе залепліваючы яе граззю. Але Анэля тады разбурыла гняздо.

На Хрыста падала цяпер сонца і ён адсвечваў. Цьмяна, як пасівелае волава.

На частакол ускочыў певень. Пачысціў дзюбу, хлопнуў крыллем. Пасля валюхнуўся ў гародчык і стаў клікаць курэй кешкацца пад язмінам.

Аркадзь апазнаў, што гэта Анэля спяшала да маста. Ажно з подбегам. Ведала куды. На малебен. Самая першая... Ён нават успомніў, як яна крычала тады на сходзе: «На мыла!» Не спрыяла яна ім, Андрэевым, і да сходу, а пасля дык пры людзях стала пляваць у іх бок:

— А яшчэ набожныя... Яна ж вызверка, Андрэіха тая...

Ранне свяжыла. Туманы, што пераначавалі ў гумнах, цяпер адпаўзаліся аж у альшэўнікі на лагі. Здавалася, што там дымяцца вогнішчы ранніх начлежнікаў.

Сёння тройца. У нашым баку яе клічуць сёмухай. Аркадзь чуў, што на сёмуху, як і на вялікдзень, сонца, калі ўзыходзіць — скача. А тут, бы насуперак, яно было нерухомае, лянівае. Нейкае бронзавае, мо' ад таго, што ранішнія туманы паклалі на яго густую палуду.

Варотцы нават не скрыпнулі. Ды няхай сабе і бразгаюць. Сястра спіць, не ўчуе гэтага. А маці ў канцылярыі. Там сёння праўленне будзе раніцай. З раёна нехта ёсць.

Аркадзь ступіў за ўзрыхлены курамі пясок. Усё — як і думалася. Колецца маладая ружа. З бэзу льецца на сарочку раса.

Падышоў да крыжа. Усутык. Даткнуўся рукой — мокры. Пакратаў. Зашамацела маладзенькае лісце перакопанай летась яблыні.

Праз вуліцу, у суседзяў, рыпнуў журавель, пасля пракрактаў, рэдка-рэдка, і сціх, бы змораны стары апусціўся на лаўку. Ён вярнуў насцярожнасць і сполах.

«Добра, што маці няма каля дому...»

Затрашчала ў каменні старое дрэва. Яго хістала маладая дужая рука. Штуршок за штуршком... Матляюцца ручнікі, сцёбаюць па ілбу. Прышлося разгрэбці рукамі зямлю і адвярнуць камень. Нарэшце, слізгаючыся пад пахай, крыж папоўз угору; паказаўся сукаваты стрыжань. Запахла цвілю. На свежую чорную зямлю пасыпалася жоўтая трухліна, нібы хто абабіў тут за гэты час вехаць выспелай дзеразы.

Праз колькі хвілін Аркадзь змятаў з падворка дзяркачом, што стаяў ля ганку, чорную зямлю, якой наабіваў з сукаватага камля.

У хаце заплакала сястра. Прачнулася, мусіць. Пераступіўшы парог, ён заўважыў, што дзяўчынка стаяла з краю, стаяла на лаве і глядзела праз акно ў гародчык.

«Яна памятыя кветкі ўбачыла...»

На другім канцы лавы сядзела маці. Спакойная, яна глядзела на яго, мокрага, запэцканага.

«І калі паспела вярнуцца?..» — спалоханы, ён аслупянеў у парозе.

— Ідзі вымыйся, арыштант. Ды пераадзенься. Сёння нядзеля. А заўтра на смалякі яго парэжам. Падпалка добрая. Нашто ж ён будзе валяцца...— паднялася яна з-за стала.— Ды з малой пабудзеш, пакуль я з праўлення прыбягу.

Буры не чакалася днём. Яна ўзнялася ноччу. Хмара прыплыла з зарэчча і павісла над вёскай.

Першыя грымоты вырвалі з цемені насцярожаную вёску. Рвануў вецер. Недзе з-за хмар. Бы там яго было спёрла і пасля грому было куды прарвацца.

Затрашчала вярба ля анэліных хлявоў, і тады пачалося...

Хлынула ўсё разам: вада, грымоты. Нехта закрычаў у канцы вёскі, туды, пад лес, і голас згубіўся ў злосным скуголенні ветру.

Над зямлёй гуло, клекатала. Неба жахалася, вырываючы з цемры ўскудлачаныя саламяныя стрэхі і глытаючы іх зноў.

Вуліца плыла, несучы салому, трасочнік, сарваныя застрэшкі.

Вуліца плыла, падмываючы прызбу.

— Не будзем, не будзем хавацца... Я не баюся з табой...

Гэта Ніна. Ей трэба амаль крычаць, а так хацелася сказаць такое ўшэпт, і мо' зусім не ў шалёную ноч...

Ён не адказвае, не пачуў, мусіць, бо ўслухоўваўся ў гэты шум і булькатанне. Яна адчувае яго плячо, спакойнае, цёплае. Пра што ён думае, чаго ён унурыўся? Нават не зважае на бурую раку, што паўзе вуліцай...

— Ніна...

— Я...

— Ты?

— Я...

Ён рэзка павярачваецца, ловіць яе рукі, спіскае іх... Яна адчувае, як пахне яго прамоклая сарочка, яна баіцца зірнуць цяпер яму ў вочы і хавае твар у яго на грудзях.

— Чуеш, як бушуе рака? Чуеш?.. Пабяжым гародамі да маста. Там лодка... Адчэпім. Згубімся ў гэтай начы там за вёскай. Сплывем. Чуеш, Ніна, як бушуе рака, чуеш?..

...Яна тулілася да цёплых грудзей Аркадзя.

Раніцай Анэля лемантавала на сваім двары:

— І не спрах жа ён... І не патануў. Жывенькі застаўся... Зубы яшчэ выскаляе. Носіць жа зямля такога.... Праз яго, праз яго гэта гора. А гаротная-я-я-я... Дзякуй, людцы...

Сціхала, услухоўваючыся ў гаманіну на двары, і пачынала зноў:

— І не патануў жа, хрыстамучанік. А казалі, што вадой яго знесла. Праз яго на мяне навала. Праз яго, праз іх... Андрэіха... Разумная, і сынка выгадавала. Гэта ж падумаць... Крыж вывалак сам, і яна ні слова не сказала. І калі я падышла была, вунь яшчэ якой здачы сыпанула. Гэта ж падумаць. Злазь, сукін сын, з гары, злазь, пакуль кадук цябе не скінуў. Гані яго, Мацей, гані...

— Завяжы, баба, язык, пакарацее мо'. Мы па нараду прыйшлі табе стрэхі ўсцягнуць. І хлопцу нарад далі. А ты, як ведзьма... Нездарма ў цябе толькі ў адной стрэхі паздзірала з начы. Відаць, грэшнай тваёй душы ніякія модлы не памогуць. Ні ўчарашнія, ні даўнейшыя. А ты, хлапец, усё ж маладзец. — Мацей гаварыў ужо толькі з Аркадзем.— Але вось лодку занадта часта чапаеш. Гэта ж я з ёю ўсю вясну валаводзіўся, пакуль да ладу давёў. А па такой рацэ яе можа... Ты то выплывеш, я ведаю... Ды і куды ты сёння з сонцам шыбануў быў? — на Аркадзя глядзелі хітраватыя вочы Мацея.

— Крыж адвозіў на далёкія-далёкія могілкі...

— Ці не праўда, ну што ты скажаш... А я думаў, каго гэта ты так асцярожна пераладжваў праз мой плот, а-я-яй...

Цюкалі ўранні сякеры, недзе на дрывотні брынчала піла. Мужчыны мітусіліся ўсюды: на двары, на сценах, пад падстрэшкам. Аркадзь з Мацеем прыбівалі латы.

Выдатны помнік польскай культуры

Няспынна пашыраюцца беларуска-польскія эканамічныя і культурныя сувязі. Працоўныя Беларусі праяўляюць вялікую цікавасць да літаратуры, музыкі, мастацтва польскага народа. Пра гэта сведчаць паспяхова праведзеныя ў чэрвені мінулага года «Дні польскай культуры» ў Беларусі, а таксама абмен дэлегацыямі прадстаўнікоў навукі, культуры і мастацтва абедзвюх рэспублік.

Польскі народ глыбока паважае і цэніць самабытную нацыянальную культуру беларусаў. У сувязі з 40-годдзем БССР і Кампартыі Беларусі ў студзені гэтага года па ўсёй Польшчы наладжваліся лекцыі, даклады і гутаркі, кніжныя выстаўкі, кінафестывалі, якія прадэманстравалі вялікія дасягненні беларускага народа ў эканоміцы і культуры, павышэнне матэрыяльнага дабрабыту працоўных. З лекцыямі і дакладамі перад працоўнымі Польшчы выступілі беларускія вучоныя, якія выязджалі туды.

Культурны абмен паміж народамі-братамі бясспрэчна паспрыяе яшчэ большаму ўмацаванню іх непарушнай дружбы.

У гэтым артыкуле мы раскажам пра выдатны помнік польскай і сусветнай культуры—адзіны ў свеце падземны музей у саляных капальнях у Вялічку пад Кракавам.

* * *

Гісторыя кракаўскіх саляных капальняў ідзе далёка ў глыбіню стагоддзяў, да часоў каралеўскай дынастыі пястаў. У адным з прывілеяў польскага караля Казіміра (1044) мы ўпершыню знаходзім упамінанне пра Вялічку — «Велька суль».

Вяліцкія саляныя капальні прыносілі вельмі вялікія прыбыткі іх уладальнікам — польскім каралям і магнатам. Існуе паданне, што старажытны Кракаў — месца каранацыі польскіх каралёў — пабудаваны з вяліцкай солі. Гэта паданне не такое ўжо далёкае ад ісціны. Вавельскі замак, большасць касцёлаў, палацаў і іншых гарадскіх будынкаў сапраўды пабудаваны пераважна на прыбытках ад продажу солі.

Але не толькі салянымі багаццямі праславілася ў стагоддзях Вялічка. Яе праславілі сваёй цяжкай працай многія пакаленні польскіх шахцёраў, якія стварылі пад зямлёй казачны «саляны горад» з выдатнымі высечанымі ў саляных скалах статуямі, падземнымі замкамі, касцёламі здзіўляючай архітэктуры і прыгажосці. Менавіта гэтыя творы працавітых рук таленавітага народа і зрабілі Вялічку выдатным помнікам не толькі польскай, а і сусветнай матэрыяльнай культуры.

У XVI ст. саляныя капальні наведалі і ўсхвалявана апісалі гуманісты, якія групаваліся вакол кракаўскай Акадэміі. Вялічка ўсё больш і больш прыцягвае іншаземцаў, а з канца XVIII ст. становіцца папулярнай сярод турыстаў з усіх краін. З таго часу Вялічку наведвалі і наведваюць вучоныя і артысты, дзяржаўныя дзеячы і турысты з усіх канцоў свету. Усе яны з захапленнем гавораць аб творах надзвычайнай прыгажосці, выкананых польскімі шахцёрамі.

Адзін французскі падарожнік, які наведаў Вялічку ў XVII ст., пісаў: «Саляныя капальні ў Вялічцы не менш славутыя, чым егіпецкія піраміды, толькі куды больш карысныя за іх. Яны з'яўляюцца пахвальным помнікам працавітасці паляк[illegible] у той час, калі піраміды з'яўляюцца сведчаннем тыраніі і бяздзейнасці старажытных егіпцян».

Па захаваных кнігах наведвальнікаў саляных капальняў можна прасачыць рост цікавасці турыстаў [illegible] Вялічкі на працягу апошніх паўтора стагоддзяў. У першых кнігах [illegible] турыстаў даходзіць да некалькіх дзесяткаў чалавек у месяц, а пазней — сотень людзей штодзённа. Гэта былі пераважна купцы, магнаты, князі, а таксама вучоныя, пісьменнікі, мастакі. Тут пабывалі вядомы польскі астраном і матэматык Ян Снядзецкі, прыяцель і адзінадумца А. Міцкевіча філамат Ігнацы Дамейка, кампазітар Станіслаў Монюшка, польскія пісьменнікі Генрых Сянкевіч, Марыя Канапніцкая, Баляслаў Прус, жывапісец Ян Матэйка і інш. У канцы XVIII ст. Вялічку наведаў Гётэ.

Пра Вялічку напісана шмат паэм, гімнаў, хронік, навуковых даследаванняў і трактатаў. Характарна, што большасць напісанага належыць пяру іншаземцаў і вельмі мала — самім палякам. Гэта сведчыць, што польскія каралі і магнаты, усяляк нізкапаклонствуючы перад усім замежным, не заўважалі і не маглі ацаніць мае быць ацаніць багатую скарбніцу культуры свайго народа, а Вялічку разглядалі толькі як крыніцу вялікіх прыбыткаў і месца весялосці.

Толькі ва ўмовах сацыялістычнай Польшчы Вялічка акружана шчодзённымі клопатамі і ўвагай урада і ўсяго народа. Яна па праву з'яўляецца нацыянальным гонарам паляка[illegible]. Тут, пад зямлёй, на глыбіні 13 метраў, у рамантычных саляных камерах створаны музей. У ім ёсць тры аддзелы: геалогіі залежаў солі, прылад працы па здабычы солі, гісторыі кракаўскіх саляных капальняў і салянога гарадка Вялічкі. У аддзеле геалогіі прадстаўлены шматлікія карты, чарцяжы, планы, фатаграфіі, мадэлі, узоры саляных крышталяў, сталакцітаў і сталагмітаў, якія характарызуюць геалагічную будову саляных гор і гісторыю ўзнікнення Вяліцкіх капальняў.

Аддзел старажытных арыгінальных прылад працы і збудаванняў адлюстроўвае развіццё тэхнікі соледабычы ад феадальных часоў да нашых дзён. Цікавыя старадаўнія дакументы, карты, гравюры і іншыя экспанаты гістарычнага аддзела расказваюць пра багатую і слаўную гісторыю кракаўскіх саляных капальняў і шахцёрскага гарадка Вялічка.

Музей наведваюць польскія рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя, шматлікія экскурсіі з сацыялістычных і капіталістычных краін. Колькасць экскурсантаў музея штогод перавышае 300 тысяч чалавек.

«Вялічка — гэта нібы сэрца Польшчы, якое ад пачатку існавання народа нястомна б'ецца рытмам напружанай працы роднай зямлі. Гістарычныя катастрофы, ваенныя пажары, вякі наволі не маглі спыніць гэтага цвёрдага рытму працы...» Гэтыя словы, сказаныя цяперашнім кіраўнікам музея Альфонсам Длугашам,—вобразная і зусім праўдзівая характарыстыка нацыянальнай гордасці Вялічкі.

Н. КАМЕНСКАЯ.

Пісьмо з Кіева

Літаратурныя музеі на Украіне

Калі Тарас Шаўчэнка вырваўся з адзінаццацігадовай няволі за Уралам і Каспіем, паэту ўдалося на кароткі час завітаць на родную Украіну. У Чаркасах над Дняпром 21 ліпеня 1859 г. ён піша верш «Колись дурною головою», у якім ад усёй душы прагне, каб створанае ім збераглося ў народзе, бо няма для мастака нічога больш страшнага як

Умерти й сліду не покинуть
На обікраденій землі...

З даўніх часоў ва ўкраінскай літаратуры моцна гучыць матыў інтэрнацыяналізма, пашаны да культуры і вызваленчай барацьбы іншых братніх народаў, напрыклад, у паэме «Каўказ» Тараса Шаўчэнкі, у шматлікіх творах Лесі Украінкі, у стаўленні Міхайлы Кацюбінскага да беларускага і малдаўскага народаў, у вершах Івана Франка і іншых.

Праяўленнем патрыятызму, глыбокай пашаны да творчасці класікаў украінскай і рускай дакастрычніцкай і савецкай літаратур з'яўляецца стварэнне на Савецкай Украіне літаратурных музеяў. Дзяржава арганізавала чатыры музеі Кабзара: у Кіеве (два), у сяле Шаўчэнкава, дзе паэт жыў у маладосці, і ў Каневе, дзе знаходзіцца магіла паэта. Існуе восем франказнаўчых устаноў: музеі ў Львове, у сяле, дзе нарадзіўся Камяняр, у Крыварыўні ў Карпацкіх гарах над рэчкаю Чарамошам, а таксама аддзел Івана Франка ў Драгабыцкім абласным музеі. Ёсць тры кабінеты франказнаўства пры вышэйшых школах, якія носяць імя паэта (пры Львоўскім універсітэце, Драгабыцкім і Жытомірскім педагагічных інстытутах). Нарэшце, пры Інстытуце літаратуры імя Тараса Шаўчэнкі Акадэміі навук Украінскай ССР у Кіеве створаны аддзел франказнаўства, які ўзначальвае акадэмік АН СССР і АН УССР Аляксандр Бялецкі. Музеі Міхайлы Кацюбінскага працуюць у Вінніцы, у будынку, дзе нарадзіўся аўтар «Фата марганы», і ў Чарнігаве, дзе жыў ён у 1898 — 1913 гг. (дырэктар — дачка пісьменніка Ірына Кацюбінская, стары член партыі). У Палтаве ёсць музеі Івана Катлярэўскага і Панаса Мірнага (дырэктарам апошняга працуе сын пісьменніка Міхайла Рудчанка). У родным сяле Васіля Стафаніка (Русава Сняцінскага раёна) музеем кіруе сын пісьменніка Кірыла Стафанік, а ў Сняціне музеем Марка Чарамшыны загадвае яго жонка Наталля Семанюкова, аўтар цікавых «Успамінаў пра Марка Чарамшыну» (Львоў, 1958). У Чарніўцах ёсць два музеі — Юрыя Фядзьковіча (у колішняй метраполіі, цяпер універсітэце) і Вольгі Кабылянскай.

Арганізаваны на Украіне і музеі рускіх класікаў, творчасць якіх арганічна была звязана з украінскай культурай. У мястэчку Каменцы на Кіраваградчыне, дзе некалі збіраліся ў дваццатых гадах XIX стагоддзя дзекабрысты, адкрыты музей Аляксандра Пушкіна і Пятра Чайкоўскага, якія доўгі час жылі ў Каменцы. У сяле Вялікія Сарачынцы Міргарадскага раёна на Палтаўшчыне працуе музей славутага земляка — Гогаля. Доўга жыў у Палтаве Уладзімір Караленка, і цяпер там ёсць літаратурна-мемарыяльны музей пісьменніка. Выдатны савецкі педагог Антон Макаранка нарадзіўся і працаваў на Украіне. Цяпер у горадзе Крукаве над Дняпром створаны музей аўтара «Педагагічнай паэмы». У 1897 — 1900 гг. жыў на Палтаўшчыне ў сяле Мануйлаўцы шчыры друг украінскага і беларускага народаў Максім Горкі, які ў сваёй аповесці «Маці» выводзіць і ўкраінца-рэвалюцыянера Андрэя Находку з Канева. Урад Украінскай ССР арганізаваў у Мануйлаўцы музей Горкага.

За гады пасля Айчыннай вайны ў гэтых музеях пабывала некалькі мільёнаў наведвальнікаў. Музеі Кацюбінскага, Чарамшыны, Кабылянскай, Стафаніка выпусцілі ў свет даведнікі, музей Юрыя Фядзьковіча — літаратурны плакат, музей Івана Катлярэўскага ў Палтаве нядаўна выпусціў зборнік навуковых прац, гэтак жа, як і чарнігаўскі музей Міхайлы Кацюбінскага. Музеі і літаратуразнаўцы з дапамогаю друку, кінахронікі, радыё, тэлестудый шырока нясуць у народ разнастайныя матэрыялы пра класікаў. Літаратурна-мемарыяльныя музеі падтрымліваюць кантакты з навуковымі ўстановамі іншых братніх рэспублік, скажам, з мінскім музеем Янкі Купалы — супрацоўнікі Кіеўскага музея Тараса Шаўчэнкі, а з Малдавіяй — музей Міхайлы Кацюбінскага.

Устанавіліся плённыя навуковыя сувязі музеяў Шаўчэнкі, Чарамшыны, Франка і з зарубежнымі даследчыкамі, перакладчыкамі, бібліятэкамі.

На Украіне пры клубах, будынках культуры, школах, бібліятэках існуюць і самадзейныя літаратурна-мемарыяльныя, гістарычныя музеі.

Напрыклад, у горадзе Няміраве на Віннічыне ў будынку былой гімназіі ў 1855—1858 гг. працаваў выкладчыкам вядомы этнограф Панас Марковіч. Жонка яго Марыя Віленская-Марковіч стварыла там свае неўміручыя «Народныя апавяданні». Рыхтуючыся да 125-годдзя з дня нараджэння пісьменніцы, выкладчыкі і студэнты мясцовага педвучылішча стварылі самадзейны музей Марка Ваўчка і Панаса Марковіча. Кіруе ім выкладчыца ўкраінскай мовы і літаратуры Вольга Дарашэнка.

Няміраўскі самадзейны музей атрымаў рад прывітанняў ад людзей розных прафесій з розных канцоў краіны. Скажам, з Прыкарпацця калгаснікі пішуць: «Няхай шырэй знаёміцца грамадскасць з творамі любімай Шаўчэнкам пісьменніцы і па яе прыкладу вучыцца моладзь працаваць на карысць свайго народа». Кітайская студэнтка Юй Фын-лян з Кіеўскага універсітэта імя Тараса Шаўчэнкі жадае музею творчых поспехаў. Краязнаўца-настаўнік з Глухава на Сумшчыне Якім Крыўко расказвае аб збіранні матэрыялаў для музея. У музеі сабрана багата такіх лістоў.

Марыя Віленская-Марковіч (Марка Ваўчок) жыла і ў іншых месцах на Украіне. Яе псеўданім узяты ад назвы сяла, якое знаходзіцца над самым Бугам, супраць старажытнага горада Брацлава. Жыла яна і ў мястэчку Багуславе, у сяле Хохітва паблізу Багуслава. Цяпер пры школах там створаны краязнаўчыя калекцыі матэрыялаў пра пісьменніцу, якія ўвесь час папаўняюцца новымі знаходкамі. Тут можна было б прыгадаць шматлікія факты патрыятычных спраў грамадскасці па ўшанаванню памяці любімых пісьменнікаў.

Возьмем яшчэ, да прыкладу, хоць бы самадзейны музей Сцяпана Руданскага на яго радзіме, у сяле Хамуцінцах Калінаўскага раёна на Віннічыне, дзе энергічна працуе Юлія Грыш, загадчыца сельскага клуба. Да 125-годдзя з дня нараджэння аўтара песні «Павей, вецер, на Украіну» сабраны для музея вельмі цікавыя экспанаты: «Іліада» Гамера, перакладзеная Сцяпанам Руданскім і выдадзеная яшчэ ў 1914 г. у Львове, эстонская літаратурная газета «Серп і молат» з успамінамі публіцысткі Лілі Промет пра ўскладанне вянка на магілу ўкраінскага класіка ў Ялце групаю рускіх, грузінскіх, фінскіх, эстонскіх пісьменнікаў, грэчаская газета з перакладзенымі гумарэскамі паэта, украінская газета з Бухарэста «Новы век» з нотамі на тэкст Сцяпана Руданскага, верш эстонскага паэта Ральфа Парве, перакладзены на ўкраінскую мову:

Жить поезия велика вічно в світі буде,
І звучать їй вільно, як співати нам,
Адже в нас тепер, Степан Руданський, всюди
Шлях співцям відкритий, як і їх пісням.

У некалі занядбаным, амаль суцэльна непісьменным сяле цяпер здзяйсняюцца мары паэта пра ўсіх. У Хамуцінцах ёсць школа, клуб, бібліятэка, кіно, лекторый, тут калгаснікі атрымліваюць звыш трохсот газет і часопісаў. Няма ніводнай хаты, дзе не было б сваёй бібліятэкі або паліцы з кніжкамі. Па традыцыі штогод тут адзначаюць дзень нараджэння Сцяпана Руданскага. Нядаўна 72-гадовы калгаснік Кузьма Бондар выступаў з дакладам пра свайго таленавітага земляка-дэмакрата. Падзяліўся ўспамінамі і старшыня сельсавета Дораш. Узнята пытанне аб тым, каб мясціну, дзе нарадзіўся паэт, перайменаваць у сяло Рудань. З сельскага музея звярнуліся да Саюза пісьменнікаў Украіны з просьбай дапамагчы выдаць зборнік мастацкіх твораў «Вянок Сцяпану Руданскаму», стварыць фільм пра любімага народам класіка літаратуры.

У Хамуцінцах сабрана нямала лістоў ад чытачоў паэзіі Сцяпана Руданскага. У адным з іх сказана: «З падтрымкаю мясцовых устаноў літаратурны музей зробіць вялікі ўклад у выхаванне савецкага патрыятызму. Няхай прыклад самаадданага служэння народу Сцяпана Руданскага, яго нястомная творчая дзейнасць натхняюць маладое пакаленне на служэнне народу, які цяпер будуе камунізм».

Шмат цікавага можна было б расказаць пра створаны да 41-й гадавіны Кастрычніка самадзейны літаратурны музей Маркіяна Шашкевіча на яго радзіме ў сяле Падлессі Алескага раёна на Львоўшчыне, дзе рыхтуюцца дастойна адзначыць 125-годдзе выхаду кніжкі «Русалка Дністрова» (1837), якою ў Галіччыне пачалася новая літаратура. Таксама шануюць землякі і памяць камуніста-драматурга Міраслава Ірчана ў сяле П'ядзіках Каламыйскага раёна на Станіслаўшчыне, Сцяпана Васільчанкі і закатаванага дзянікінскай контрразведкай паэта Васіля Чумака на іх радзіме ў мястэчку Ічні на Чарнігаўшчыне, і загінуўшага на фронце таленавітага празаіка Алексу Дзесняка ў Сосніцы...

Любіць нарад сваіх пісьменнікаў!

Для рэгулярнага папаўнення літаратурных музеяў і інстытутаў пры Акадэміях навук саюзных рэспублік матэрыяламі з братніх рэспублік СССР варта было б па лініі Міністэрства культуры наладзіць узаемны абмен перакладамі, друкаванымі выданнямі, бібліяграфіяй. Менавіта пра гэта пісалі 64 дзеячы культуры з 32 рэспублік (ад Беларусі—Якуб Колас і Пятро Глебка) у нумары чацвёртым часопіса «Дружба народаў» за 1956 г. Потым пра гэта пісалі і «Литературная газета» (17 сакавіка 1957), «Известия» (1 сакавіка 1958), «Літаратура і мастацтва» (26 ліпеня 1958). Напярэдадні Усесаюзнага з'езду пісьменнікаў варта было б здзейсніць гэтыя каштоўныя прапановы.

Ю. НАЗАРЭНКА.

ГАСТРОЛІ АМЕРЫКАНСКАГА БАЛЕТУ НА ІЛЬДУ

У Палацы спорту Цэнтральнага стадыёна імя Ул. І. Леніна ў Маскве праходзяць гастролі амерыканскага балету на ільду.

На здымку: танец са сцэны «Свята ў Альпах».

Фатахроніка ТАСС.

Дружба музычных школ

Дружба, таварыская ўзаемадапамога, перадача і перайманне вопыту — вось характэрныя рысы, уласцівыя калектыву педагогаў і навучэнцаў Мінскай музычнай школы-дзесяцігодкі.

Захоўваючы гэтую слаўную традыцыю, калектыў школы моцна пасябраваў з навучальнымі ўстановамі іншых гарадоў, а таксама з музычнымі школамі братніх рэспублік. Так, напрыклад, у свой час завязалася дружба з навучэнцамі Маскоўскай Цэнтральнай і Вільнюскай музычных школ-дзесяцігодак.

Групы педагогаў і навучэнцаў Мінскай музычнай школы-дзесяцігодкі часта выязджаюць для аказання дапамогі і абмену вопытам у музычныя школы рэспублікі і ў той жа час гасцінна прымаюць дэлегацыі іншых школ.

Днямі ў Мінскай музычнай школе пабывала група педагогаў і навучэнцаў Кіеўскай музычнай школы. У час гэтай сустрэчы педагогі музычных школ абмяняліся думкамі па пытаннях арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы, методыцы выкладання і навучання. Апроч таго, адбыліся творчыя сустрэчы навучэнцаў Кіеўскай школы з выхаванцамі Мінскай музычнай школы.

Госці з Кіева далі цікавы канцэрт. Асабліва вялікі поспех выпаў на долю вучаніцы шостага класа Т. Дзераноўскай, якая выканала на раялі «Патэтычную санату» Бехтовена і «Украінскае скерца» ўкраінскага савецкага кампазітара Сільванскага, вучня дзевятага класа скрыпача В. Кірзунова, які па-майстэрску выканаў «Легенду» Вяняўскага і п'есу «Мары» ўкраінскага кампазітара Касенкі.

Цёпла была прынята выканаўца на ўкраінскім народным інструменце вучаніца восьмага класа бандурыстка А. Шапціцкая.

У дні прабывання ў Мінску госці з Кіева выступілі з канцэртамі перад рабочымі і служачымі трактарнага і станкабудаўнічага заводаў, перад студэнтамі і прафесарска-выкладчыцкім складам Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

Навучэнцы Мінскай музычнай школы-дзесяцігодкі далі ў адказ вялікі канцэрт.

Гасцям былі паднесены прывітальны адрас, альбом з відамі Мінска, творы беларускіх кампазітараў.

Галоўны рэдактар Янка ШАРАХОЎСКІ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

КІНАСТУДЫЯ «БЕЛАРУСЬФІ